

РАДЫЯЦЫЯ НА СЛУЖБЕ Ў МЕДЫКАЎ 5

ЯК «БЕЛАРУСЬФІЛЬМ» ПЕРАЖЫВАЕ КРЫЗІС 8



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родным мове

# ЗВЯЗДА

16 МАЯ 2020 г. СУБОТА № 94 (29208)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Марына АРЦЁМЕНКА, начальнік упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны:**

*«Падтрымка сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, будзе знаходзіцца ў фокусе ўвагі дзяржавы і ў надыходзячым пяцігоддзі. Асноўныя кірункі развіцця — удасканаленне сістэмы матэрыяльнай падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, павышэнне ролі адказнага бацькоўства, заахвочванне да роўнага ўдзелу абодвух бацькоў у выхаванні і развіцці дзяцей, уцягванне наймальнікаў у падтрымку работнікаў з сямейнымі абавязкамі шляхам развіцця канцэпцыі «Кампаніі, дружалюбныя бацькам». Сутнасць яе ў тым, каб стварыць імідж работніка з сямейнымі абавязкамі, прывабнага для наймальніка. Шматдзетны чалавек як работнік мае ўсе неабходныя якасці: ён шматфункцыянальны, стрэсаўстойлівы, вырашае адначасова некалькі задач, дысцыплінаваны. А значыць, з'яўляецца добрай інвестыцыяй у кампанію».*


Фота БелТА.

З першых вуснаў

# «Да вас павінны потым прыязджаць і вучыцца»

Інтэграваныя структуры дапамогуць адрадзіць сельскую гаспадарку Віцебшчыны і не толькі — передавы вопыт пілотнага праекта будзе перанесены на іншыя рэгіёны краіны

**Учора раніцай верталёт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ўзяў курс на Віцебшчыну. Наведаць рэгіён кіраўнік краіны збіраўся даўно, але канкрэтны пункт на карце вобласці вызначыў толькі напярэдадні. Вялікія выхадныя і святы — за спінай. Час для камандзіровак і праверкі выканання даручэнняў, дадзеных раней.**

СТАР. 2



# ЧАЎНЫ ВІЛЬЧЫНСКІХ

Для жыхароў Паазер'я драўляная пласкадонка — і сёння даволі актуальны транспарт. Пра гэта сведчыць попыт на лодачную прадукцыю Уладзіміра ВІЛЬЧЫНСКАГА з вёскі Заазер'е Сенненскага раёна. Сёлета Уладзімір Вячаслававіч зноў габлюе дошкі, выпілоўвае какоры, варыць смалу, робіць лодкі — у сваім адметным і дасканальным стылі. Сярод першых памагатых майстра — яго сын Дзмітрый, студэнт-завочнік Горацкай сельгасакадэміі, будучы спецыяліст прамысловай рыбагадоўлі. Летась мне з ім не давялося сустрэцца — 30-гадовы заазерскі жыхар у гэты час лавіў прамысловую рыбу на далёкай Камчатцы. А сёлета па вядомых прычынах яму давялося застацца на радзіме і, канешне, дапамагаць бацьку.

— Гэтай вясной мы ўжо зрабілі шэсць лодак, — кажа Дзмітрый Вільчынскі. — Дзякуючы бацьку, які перадае мне свой вопыт і сакрэты, лодачная справа ў нашым краі не загіне.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Рэальныя грашовыя даходы беларусаў у I квартале выраслі на 7,1 %.**
- У Беларусі жыве больш за 108 тысяч шматдзетных сем'яў.
- **Гарачую ваду ў дамах з 2021 года будуць адключаць не больш чым на 13 дзён.**
- Германія адмяняе каранцін для тых, хто ўязджае з краін ЕС.
- **Беларусь пачынае пастаўкі нафты з ЗША.**
- У Гродне машына з-за аварыі павісла на слупе.
- **Тыдзень бэзу пачынаецца ў батанічным садзе з 16 мая.**

ISSN 1990 - 763X

Дабрачыннасць

# І СЕЮЦЬ, І КОРМЯЦЬ

Адна з перадавых гаспадарак Магілёўскай вобласці ЗАТ «Агракамбінат «Зара» паспявае ўмацоўваць харчовую бяспеку краіны і дапамагаць медыкам.

**Прыклады дабрачыннасці ў барацьбе з каварным вірусам працягваюцца. У добрай справе ўдзельнічаюць не толькі валанцёры, бізнесмены, сацработнікі, дэпутаты, але і прадстаўнікі сельскай гаспадаркі. Трэба аддаць ім належнае: у разгары палявыя работы, а яны знаходзяць і сілы, і сродкі, каб займацца дабрачыннасцю. Штодзень яны перадаюць Магілёўскай бальніцы № 1 сто бясплатных комплексных абедаў.**

Ініцыятарам акцыі стала генеральны дырэктар ЗАТ Кацярына Зароўская. Калектыў яе падтрымаў. Усе разумеюць, як сёння цяжка ўрачам — некаторыя з іх суткамі не выходзяць з бальніцы, не бачацца з роднымі.

— З тым, што трэба дапамагаць, адразу ж пагадзіліся ўсе, думалі толькі спачатку — як? — кажа **Таццяна ДЗЯКАВА, намеснік генеральнага дырэктара ЗАТ «Зара» па якасці.** — У гаспадаркі ёсць свой швейны цэх, але шыць маскі для ўрачоў можа кожны. Мы імі забяспечваем свой гандаль. А медыкам вырашылі дапамагаць абедамі. Кацярына Зароўская дамовілася з галоўным урачом бальніцы накont таго, як будзем узаемадзейнічаць. Стравы адрасаваныя менавіта тым урачам, якія працуюць з «кавіднымі» пацыентамі. 100 штодзённых абедаў за месяц у сярэднім абыходзяцца нам крыху болей чым у 70 тысяч рублёў. Але што гэта ў параўнанні з тым, што робіць для нас медыкі? У нас ёсць куды накіраваць грошы, але дапамога бальніцы — на сённяшні дзень галоўнае. На ўсё астатняе заробім — было б здароўе.

Да акцыі далучылася індывідуальны прадпрымальнік Раіса Навуменка, якая працуе ў Рэчках. Праз гаспадарку яна передала медыкам ваду, газіраваныя напоі, гарбату, каву. Свой ўнёсак у добрую справу робіць аграфірма «Кадзіна», дзе «Зара» бярэ агародніну для сваёй акцыі. Гаспадарка дае вялікую зніжку на прадукцыю.

СТАР. 3



● З ГІСТОРЫІ ПЫТАННЯ

**Віцебшчына, вобласць рызыкоўнага земляробства, ужо доўгі час на асаблівым кантролі ў Прэзідэнта. Для вырашэння праблем паўночнага рэгіёна ў 2016 годзе пайшлі на эксперымент — стварылі некалькі інтэграваных структур з поўным цыклам вытворчасці ў АПК. Але назваць пілотны праект паспяховым адразу не выпадала. Ініцыятыва далучыць да моцных гаспадарак слабейшыя мела эфект, але кардынальна сітуацыю не змяніла. Пра гэта прадстаўнікі вышэйшых эшалонаў улады ўжо гаварылі на гістарычнай для Віцебска нарадзе ў лістападзе 2019-га. Якім чынам складваюцца справы ў АПК рэгіёна праз паўгода пасля сур'ёзнай размовы, Прэзідэнт убачыў на ўласныя вочы.**

# «Да вас павінны потым прыязджаць і вучыцца»

У якасці прыкладу развіцця інтэграваных структур абралі ААТ «Малако». Прадпрыемства — найбуйнейшы вытворца «малочкі» ў вобласці. На яго магутнасцях перапрацоўваецца пятая частка малака ўсяго рэгіёна. Спажыўцу і экспарцёрам прадукцыя вядомая пад брэндам з простай назвай «Віцебскае малако». Унітарным прадпрыемствам у структуры выдзелена «Рудакова» з яго вытворчымі ўчасткамі «Вымна» і «Палудзеткі». Менавіта з іх комплексамі і азнаёміўся Прэзідэнт падчас камандзіроўкі.

## УЛАСНАЯ ФОРМУЛА ДЛЯ РЭГІЁНА

На комплексе «Мішуткі» кіраўніку краіны расказалі пра тэхналогію вырошчвання цялушак. Ён, у сваю чаргу, станоўча ацаніў дасягненні жывёлаводаў: «Будзе вынік — будуць грошы. Калі будзе нейкі рух, вынік, пры ўсёй беднасці мы вам дапаможам. Так, дапамагалі, але і яшчэ будзем дапамагаць».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што на Віцебшчыне хоча пагледзець, як развіваюцца сем створаных аграпрамысловых аб'яднанняў — новых фармаў, распрацаваных для паўночнага рэгіёна. У холдынгі ўваходзяць 130 вытворцаў збожжа, мяса, малака. На іх чале стаяць канцавыя прадпрыемствы — Глыбоцкі малочна-кансервавы камбінат, Верхнядзвінскі масласырзавод, Віцебскі мясакамбінат, ААТ «Малако», Пастаўскі малочны завод, Аршанскі малочна-кансервавы і Полацкі малочны камбінаты.

«Дзякуючы ўсім вам мы намацалі гэту форму. Мая справа была ўжо прарэзіваць і сказаць «так» ці «не». Я бачу, што гэта зямное. Ад зямлі ідуць кармы. Малако, мяса ідуць цяпер на перапрацоўку. Перапрацаваў — прадаў. Грашовыя патокі пайшлі туды, адкуль прыйшлі малако, мяса», — адзначыў Прэзідэнт.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На яго думку, пры развіцці ў такім рытме магчыма за пяць гадоў адрадзіць віцебскую зямлю. Грошы, якія цягам часу павінны з'явіцца ў АПК вобласці, накіруюць на рэкультывацыю палёў.

На рабатызаваным комплексе «МТК-Буева» Прэзідэнт азнаёміўся з сучаснай арганізацыяй вытворчасці малака. Аграрыі хваляць аўтаматызаваную сістэму. Цяжка паверыць, але перспектыўны комплекс калісьці быў у заняпадзе. Нават шукалі грошы, каб яго разбурыць. Сёння аграрыі кажуць: шчасце, што сродкі тады не знайшлі.

## ПЫТАННЕ ДЛЯ ЎСЁЙ КРАІНЫ

Апошнія месяцы рабочыя паездкі кіраўніка дзяржавы завяршаюцца ці гутаркай з журналістамі, ці размовай з працоўнымі калектывамі. Візіт на Віцебшчыну стаў выключэннем — пытанне надзвычай важнае, з патэнцыйнымі наступствамі для ўсёй краіны. Таму вынікі падводзілі на адмысловай нарадзе.

На ёй, дарэчы, Прэзідэнт папярэдзіў, што ў найбліжэйшы час, а то і цягам пяцігодкі (у залежнасці ад вынікаў выбараў) работа будзе весціся менавіта ў такім стылі.

На нарадзе прысутнічалі кіраўнікі створаных у Віцебскай вобласці сямі інтэграцыйных структур. Аляксандр Лукашэнка нагадаў сутнасць такіх аб'яднанняў: мясакамбінатам і малаказаводам у якасці сыравінных зон перадалі нерэнтабельныя гаспадаркі.

Прэзідэнт падкрэсліў, што паездка адбылася не на перадавое прадпрыемства, а на самае звычайнае, шараговае. ААТ «Малако» — адна з дзвюх інтэграцыйных структур Віцебскага раёна.

***«Гэта тое, як павінна быць ва ўсёй Віцебскай вобласці, але толькі па якасці, па тэхналогіях, па аддачы, па эфектыўнасці вышэй, чым тут. Думка была простая, зямная, калі мы прымалі рашэнне па інтэграцыйных структурах: ёсць зямля, ёсць людзі, дапаможам з тэхнікай, падключым розныя рэсурсы»***, — сказаў Прэзідэнт.

## І ПОЛЕ, І ЗАВОД

Ён перасцярог галаўныя прадпрыемствы ад спакусы нажывацца на сялянах. Большая частка грошай ад продажу сыравіны павінна вярнуцца на вёску, каб заўтра атрымаць яшчэ больш малака, калі гэта трэба будзе для рынку.

Разам з тым галаўныя прадпрыемствы павінны быць самымі перадавымі. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: сёння аб'ёмы вытворчасці можна павялічваць, калі вырабляеш такі прадукт, які спажыўцы «адрывалі б з рукамі-нагамі». А значыць, інтэгратары (малаказаводы і мясакамбінаты) павінны быць тэхналагічна аснашчаны на самым высокім узроўні. «Узоры такіх гаспадарак ёсць, — заўважыў Прэзідэнт. — Высокія тэхналогіі, самыя перадавыя — капіруйце».

***«Для Віцебскай вобласці адступаць няма куды — да вас павінны потым прыязджаць і вучыцца, як арганізоўваць падобныя інтэграцыйныя структуры і выцягваць стратныя прадпрыемствы адзіным ланцужком»***, — паставіў задачу беларускі лідар.

Аналагічныя структуры можна ствараць і ў іншых абласцях краіны, у чым і спатрэбіцца досвед Віцебшчыны. Таму Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, што ход мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі ў Віцебскай вобласці і надалей будзе абмяркоўвацца на месяцах. «Рэалізуем гэта, пераможам — будзе плён. Калі мы ўжо ў Віцебскай вобласці можам узняць сельскую гаспадарку, прывесці ў парадак, каб людзі тут працавалі і радаваліся і каб моладзь сюды ішла... А моладзь пойдзе», — перакананы Прэзідэнт.

## АСЭНСАВАННЕ ДАДЗЕНАГА

І хоць тэма паездкі і нарады па яе выніках дакладна акрэсленыя, Прэзідэнт не мог не закрануць і пытанне, якому ўдзяляецца шмат увагі ў грамадстве, — эпідэміі каранавіруснай інфекцыі і яе ўплыву на розныя галіны нашага жыцця.

«У гэтай пандэміі так званай, у гэтай істэрыі ёсць і станоўчае. Як у глабальным плане ў свеце (усе зразумеюць, чаго мы вартыя і хто ў нас сябар, хто вораг), так і на нізкім узроўні, у адносінах паміж людзьмі. ***Станоўчае тое, што яна крыху падштурхнула людзей, і людзі зразумелі, што трэба трымацца за зямлю.*** А што да хвароб (а яны будуць у нас, гэтыя вірусы, заўсёды), вёска — гэта выратаванне, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што дзякуючы знешнім абставінам беларусы здзяйсняюць пераацэнку сваіх дзеянняў і жыццёвых устояў. «І гэта на карысць сельскай гаспадаркі», — заключыў Прэзідэнт.

Асобнай тэмай на нарадзе стала профільная адукацыя — падрыхтоўка спецыялістаў для сельскай гаспадаркі. На думку Прэзідэнта, кіраўнікі сельгаспрадпрыемстваў мусяць разумець, у кім ёсць патрэба, хто прыйдзе на работу.

## ПРАЗ КРЫЗІС ДА НОВЫХ МАГЧЫМАСЦЯЎ

Пра ход веснавых палявых работ і стан сельскай гаспадаркі краіны далажыў кіраўніку дзяржавы профільны міністр Іван Крупко. Па яго словах, за чатыры месяцы галіна спрацавала з ростам 105 працэнтаў, падрос на 9 працэнтаў і экспарт за тры месяцы.

Тут Аляксандр Лукашэнка спыніў спікера і запытаў, ці ёсць залежы экспартнай прадукцыі на складах. Міністр адказаў, што сітуацыя ў цэлым стабільная: «Усё ў рабоце. Ёсць кантракты, яны рэалізоўваюцца. Кантралюем гэта амаль кожны дзень. Размаўляем з абласцямі. Няма сёння праблем у Магілёва, няма ў Віцебскай вобласці, крыху затавараны па сухім малаку склады ў Мінскай і Гродзенскай абласцях».

Аграрыі запэўніваюць, што са збытам малака вялікай праблемы няма. Пытанне ў цане, якую гатовыя заплаціць пакупнікі.

Сяўба яравых у краіне амаль завершана. Засталося пасеяць 143 тысячы гектараў, з іх амаль палова — пад кукурузу. Аграрыі правялі сапраўдную навуковую работу па павелічэнні пасеваў грэчкі, абучылі людзей, вызначылі гаспадаркі, знайшлі насенне. Па словах міністра, няма сумневу, што 22,8 тысячы гектараў будзе засеяна гэтай культурай.

Калі па грэчцы беларускія спецыялісты толькі намацваюць сваю нішу, то па бульбе пытанняў няма. Планы пасеву перавышаныя. Тут Прэзідэнт падзяліўся сваімі адчуваннямі — вопыт падказвае, што сёлета бульба будзе ў цане — купяць расіяне і ўкраінцы. Яшчэ раз Аляксандр Лукашэнка нагадаў: пасеяць — не толькі ўпіхнуць у зямлю клубень, а займацца культурай па тэхналогіі. «Калі ў нас будзе што прадаць, мы заўсёды прададзім па добрай цане. Нашы сяляне гэтага заслужылі. Мы нямала ўкладалі працы і грошай у сельскую гаспадарку, мучыліся, прадаючы харчаванне, а цяпер з рукамі і нагамі яго забяруць», — упэўнены Прэзідэнт.

Сярод даручэнняў для аграрыяў не толькі вобласці, але і ўсёй краіны — якасна працаваць з кармамі, рыхтаваць паліва і тэхніку, у тым ліку і для будучай уборачнай кампаніі. Пытанне з недахопам камбайнаў Прэзідэнт даў указанне вырашаць сумесна з «Гомсельмашам».

Аляксандр Лукашэнка параіў пераносіць вопыт віцебскіх інтэграцыйных структур і на іншыя рэгіёны: ***«Хоць па адной інтэграцыйнай структуры трэба ствараць. Яны ў любой, нават Гродзенскай вобласці ў нейкіх раёнах патрэбны».***

## ПРА ШТО КАЖУЦЬ ФІНАНСЫ

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарснёў далажыў Прэзідэнту, што за тры сёлетнія месяцы ў Віцебскай вобласці дынаміка па паказчыках станоўчая. У прыватнасці, валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі склала 103,2 працэнта, будаўніча-мантажныя работы — 126 працэнтаў, рознічны тавараабарот — 102 працэнты, выдаткі зніжаны на 1,7 працэнта. Экспарт тавараў склаў 106 працэнтаў, прамыя замежныя інвестыцыі павялічыліся ў два разы.

«Інвестыцыі ў цэлым летась былі 103 працэнты, сёлета — 117 працэнтаў. Гэта асноўная крыніца для развіцця вытворчасці. У цэлым па вобласці прырост неблагі. Асноўную долю інвестыцый у вобласці займаюць камунальныя і бязведамасныя прадпрыемствы», — паведаміў Мікалай Шарснёў.

Усе гэтыя паказчыкі ствараюць станоўчую фінансавую сітуацыю, рэнтабельнасць сёлета павялічылася амаль у два разы.

**Марыя ДАДАЛКА,**
**Варвара МАРОЗАВА,**
*Віцебскі раён.*

● КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** нагадаў журналістам, што ў лютым прыняты Указ Прэзідэнта аб развіцці аграпрамысловага комплексу Віцебскай вобласці.

«Няпростыя часы былі і раней, калі мы пачыналі працаваць практычна з нуля. Тады была распрацаваная Праграма адраджэння і развіцця вёскі, тады мы стварылі добрыя аграгарадкі, укаранілі ў сельскай гаспадарцы сацыяльныя стандарты. Практычна ў кожным раёне арганізавалі аперацыйныя, рэанімацыйныя, якія, напэўна, у многім дапамаглі нам і цяпер», — сказаў спікер ніжняй палаты парламента.

А эканоміку Віцебскай вобласці стварылі фактычна з нічога. Рэканструкцыя «Нафтана», маслаэкстракцыйны завод у Віцебску, мадэрнізацыя ўсіх мяса- і малочных камбінатаў — закладзена аснова для стабільнай работы, падсумаваў парламентарый.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Гендырэктар Сусветнай гандлёвай арганізацыі пакідае пасаду




Кіраўнік СГА вырашыў пакінуць сваю пасаду на год раней — 31 жніўня 2020-га, паведаміла арганізацыя. Сам Раберту Азеведу падчас віртуальнай канферэнцыі з усімі краінамі — членамі арганізацыі адзначыў, што яго рашэнне не звязана са станам здароўя, а таксама з жаданнем атрымаць іншую пасаду. «Паколькі члены СГА пачынаюць фарміраваць парадак дня работы арганізацыі ў новых умовах пасля COVID, яны павінны рабіць гэта з новым генеральным дырэктарам», — заявіў Азеведу.

## Грэцыя ўзначаліла еўрапейскі Камітэт міністраў

Грэцыя на паўгода ўзначаліла Камітэт міністраў Савета Еўропы. Цырымонія перадачы старшынства ад Грузіі прайшла ў анлайн-фармаце. Новы старшыня Камітэта міністраў СЕ, першы намеснік міністра замежных спраў Грэцыі Мілтыядзіс Варвіцыёціс, адказны ў МЗС за справы Еўрасаюза і Савета Еўропы, прадставіў прыярытэты грэчаскага старшынства. Старшынства Грэцыі з-за пандэміі будзе электронным, значную частку мерапрыемстваў давядзецца праводзіць з дапамогай тэлеканферэнцый, заявіў Варвіцыёціс. Краіна мае намер у пачатку чэрвеня арганізаваць лічбавую дыскусію высокага ўзроўню, адкрытую для грамадскасці, на тэму ўплыву пандэміі COVID-19 на правы чалавека і асноўныя свабоды. Грэчаскае старшынства завершыцца 18 лістапада, калі Камітэт міністраў Савета Еўропы ўзначаліць Германія.

## Славенія абвясціла пра завяршэнне эпідэміі каранавіруса

«Сёння ў Славеніі складваецца самая спрыяльная эпідэміялагічная сітуацыя ў Еўропе, якая дазваляе нам абвясціць пра канец эпідэміі», — заявіў прэм'ер-міністр Янез Янша, перадае Reuters. З пачатку пандэміі каранавіруса ў Славеніі, якая мяжуе з Італіяй, выявілі толькі 1,5 тысячы заражэнняў, памерлі 103 пацыенты. Тым не менш улады пакінулі ў сіле масачны рэжым у грамадскіх месцах, у краіне таксама працягнуць дзейнічаць правілы сацыяльнага дыстанцыявання, забаронены грамадскія сходы. Яны будуць дзейнічаць як мінімум да канца месяца. На наступным тыдні ў Славеніі адкрыюцца некаторыя гандлёвыя цэнтры і гатэлі. Спартыўныя турніры могуць аднавіцца ў краіне з 23 мая.

На кантролі

# «МЫ НА ПРАВІЛЬНЫМ ШЛЯХУ»

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла сустрэчу з кіраўнікамі і работнікамі медыцынскіх устаноў Брэсцкай вобласці, перадае БелТА.**



Фота БелТА.

Па даручэнні кіраўніка дзяржавы спікер наведвае рэгіёны, каб на месцы ацаніць эфектыўнасць мер па барацьбе з каранавіруснай інфекцыяй. Гэтае пытанне знаходзіцца на асабістым кантролі Прэзідэнта.

Наталлю Качанаву дэталёва праінфармавалі аб эпідэміялагічнай сітуацыі ў Брэсцкай вобласці. Было адзначана, што рэгіён увайшоў у эпідпрацэс самы апошні. «Мы падлічылі ўсе свае сілы і магчымасці. У цэлым у нас больш за 13,7 тысячы ложкаў. З іх для аказання дапамогі пацыентам з COVID-19 выдзелена 6832, цяпер занята 3195. Таксама ў нас ёсць 350 апаратаў штучнай вентыляцыі лёгкіх, 150 наркозна-дыхальных. За кошт спонсарскіх сродкаў закупілі яшчэ 14 апаратаў высокага класа, якія могуць вентыляваць доўгі час», — адзначыў **начальнік галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Брэсцкага аблвыканкама Віктар МІХАЛОЎСКІ.** Ён дадаў, што медыцынскія ўстановы амаль на чвэрць павялічылі колькасць пунктаў вываду кіслароду. Былі закуплены кіслародныя канцэнтратары.

Выпрацавана сістэма шпіталізацыі пацыентаў з каранавіруснай інфекцыяй. Большасць хворых праходзіць лячэнне ў раённых бальніцах або амбулаторна. Больш цяжкіх хворых дастаўляюць у міжраённыя цэнтры ў Баранавічах і Пінску, абласную клінічную бальніцу. «Тых, каго трэба далячыць, адпраўляем у абласны скурна-венералагічны дыспансер. Пераводзім пацыентаў і ў процітуберкулёзны дыспансер з улікам таго, што там персанал «заточаны» на работу з інфекцыяй», — растлумачыў Віктар Міхалоўскі. Ён дадаў: у абласным радзільным доме для цяжарных з COVID-19 выдзелена асобнае крыло.

«Гледзячы на вопыт нашай краіны і іншых краін, бачым, што мы знаходзімся на правільным шляху і ўсё правільна зрабілі. Выбудаваная ў Беларусі сістэма па лячэнні хворых на каранавірус сябе апраўдала. Людзі з лёгкім ходам хваробы могуць лячыцца амбулаторна, з больш цяжкай формай шпіталізуем, — адзначыла Наталля Качанава. — Гэта інфекцыя непрадказальная, але мы павінны змагацца за жыццё кожнага чалавека. Для гэтага ў нас ёсць усе магчымасці: койка-месцаў хапае, абсталявання, у тым ліку апаратаў ШВЛ, дастаткова».

Наталля Качанава звярнула ўвагу на эфектыўнасць камп'ютарнай тамаграфіі пры дыягностыцы віруса. Яна пацікавілася, ці ёсць неабходнасць у замене або закупцы новых апаратаў. Так, у галіне цяпер працуюць 11 КТ. У Столінскай і Кобрынскай раённых бальніцах падрыхтавалі кабінеты пад установку абсталявання. Старшыня Савета Рэспублікі ўзяла на кантроль пытанне пастаўкі гэтых апаратаў. Таксама ёсць неабходнасць у замене КТ на сучасныя ў Лунінецкай і Драгічынскай ЦРБ.

У час сустрэчы пільная ўвага была ўдзелена забеспячэнню медработнікаў сродкамі індывідуальнай аховы. У лячэбных установах Брэсцкай вобласці ёсць запас касцюмаў і рэспіратараў на тэрмін у сярэднім ад аднаго да паўтара месяца.

## ● Тым часам

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА 19 мая правядзе прамую тэлефонную лінію.

Патэлефанаваць можна з 11.00 да 14.00 на нумар у Мінску (017) 328 53 24.

На наступны дзень, 20 мая, прамую тэлефонную лінію правядзе старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ.

26 мая адказваць на пытанні грамадзян па тэлефоне будзе старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ.

27 мая званкі будзе прымаць старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ.

Задаць сваё пытанне членам Прэзідыума Савета Рэспублікі можна будзе з 10.00 да 13.00 па тэлефоне ў Мінску (017) 328 53 24.

# І СЕЮЦЬ, І КОРМЯЦЬ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Не засталося ўбаку і ААТ «Белпрамтара», у якога агракамбінат купляе кардонныя скрыні для бясплатных абедаў — адпускае тавар, лічы, за сімвалічны кошт. У гэтую тару работнікі сталоўкі аграгаспадаркі складваюць ёмістасці з супамі і ланчбоксы з гарачымі стравамі і салатамі, а таксама выпечку і хлеб уласнай вытворчасці. Мясная прадукцыя, дарэчы, выключна «зароўская», аграгаспадарка займаецца вырошчваннем і перапрацоўкай птушкі, свінін і ялавічыны.

— Дагавор аб бязвыплатнай дапамозе ў нас з бальніцай быў заключаны спачатку на месяц, а цяпер мы гэты тэрмін працягнулі, — удакладняе Таццяна Анатолеўна. — І будзем дапамагаць да зніжэння эпідсітуацыі. Усе работнікі такое рашэнне падтрымалі аднагалосна. Мы лічым, што гэта вельмі малая частка таго, што мы можам зрабіць сёння для медработнікаў. Любую навалу прасцей пераадолець праз дабрыню і чалавечнасць. Менавіта ў гэтым сіла.

### АБ'ЁМЫ ПАВЯЛІЧЫЛІ Ў ТРЫ РАЗЫ

Прадукцыя з мяса птушкі, свініны і ялавічыны ад шматпрофільнай гаспадаркі «Зара» карыстаецца нязменным попытам у спажыўцоў. А абеды, што гатуюць у тутэйшай сталоўцы, здольныя падняць настрой і падмацаваць нават зусім страчаныя сілы. У сярэднім кухары аграрамкамбіната гатавалі для сваіх работнікаў 60 порцый гарачых абедаў, а цяпер аб'ёмы павялічыліся амаль у тры разы. «Але магутнасцяў хапае», — супакойвае **загадчыца сталоўкі Таццяна ПАДДУБСКАЯ.**

Таццяна Паддубская, Юлія Давыдава, Хрысціна Зарыдзэ, Ала Яршэвіч, Жанна Уласава, Марыя Вараб'ёва, Людміла Ісаева — гэта тая каманда, якая штодзённа на сваіх рабочых месцах ужо з сямі гадзін раніцы, каб паспець накарміць гарачымі абедамі ўсіх — і сваіх работнікаў, і медыкаў. Усе сем чалавек на кухні ўзаемазамяняльныя. Нехта варыць суп, хтосьці смажыць мяса, іншы гатуе салат. Кухары і кухонныя рабочыя працуюць выключна ў спецадзенні. Кухня ў сталоўцы — гэта тая ж аперацыйная, тут усё павінна быць стэрыльна. «Пальчаткі, маскі, аднаразовыя галаўныя ўборы — дысцыпліна перш за ўсё», — кажа загадчыца сталоўкі.

### ПРАЦУЕМ З НАТХНЕННЕМ

Летась тут быў зроблены грандыёзны рамонт.



**Таццяна ПАДДУБСКАЯ, Юлія ДАВЫДАВА, Хрысціна ЗАРЫДЗЭ, Марыя ВАРАБ'ЁВА, Жанна УЛАСАВА, Ала ЯРАШЭВІЧ: «Гатуем з задавальненнем».**

— Пасля яго кухню было не пазнаць, — кажа загадчыца. — На ўзбраенні ў нас найлепшае кухоннае абсталяванне — параканвектамат, марміт для падагрэву страў, розныя электрычныя прыстасаванні для нарэзкі прадуктаў. Закуплена новая мэбля для абедзеннай залы. Ад старой сталоўкі засталася толькі шыкоўная карціна з мазаікі на ўсю сцяну. Гісторыю яе стварэння ўжо ніхто дакладна і не ведае. Зроблена яна была, мяркуючы па надпісе, у 1980 годзе.

— Гэта цяпер наша фотазона, — смяюцца дзяўчаты і з задавальненнем пазіруюць на фоне маляўнічага пейзажа з аленямі. Абеды ўжо зваранымі і ўпакаваныя, можна на хвіліну прыпыніцца і перавесці дыханне.

За дастаўку абедаў у бальніцу адказны кіроўца Канстанцін Навуменка. Ён павінен быць там а палове на першую. Акрамя гэтага, Канстанцін развозіць абеды для работнікаў аграгаспадаркі, якія таксама снедаюць без адрыву ад вытворчасці.

На кухні тым часам наводзіцца парадак і робіцца нарыхтоўкі на заўтра. І, як прызнаюцца работніцы сталоўкі, стомленасці няма. Наадварот, прыемна, калі твая работа прыносіць камусьці задавальненне. Таццяна Паддубская згадвае, як нядаўна заглянула ў госці да сяброўкі і пазнаёмілася з урачом Магілёўскай бальніцы № 1. «Калі яна даведалася, дзе я працую, вельмі дзякавала. «Вы ж нас так смачна корміце», — сказала яна. Было вельмі прыемна пачуць гэтыя словы. Пасля такога хочацца працаваць з падвоенай сілай. Мы ж сапраўды стараемся, каб стравы былі і смачныя, і разнастайныя. А калі нашу працу яшчэ і ацэньваюць, гэта сапраўды натхняе», — рэзюмуе суразмоўніца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
*Магілёўскі раён.*

На слыху

## Эпідэміёлаг: «Да канца месяца, а ў чэрвені дакладна захваральнасць пойдзе на спад»

**На 15 мая ў Беларусі выяўлена 27 730 выпадкаў COVID-19. Папраўлася і выпісана 8807 пацыентаў, 156 чалавек памерла. Больш за тыдзень кожныя суткі з'яўляецца звыш 900 новых выпадкаў, за апошнія — 958. З пачатку ўспышкі ў краіне праведзена 321 705 тэстаў.**

**Намеснік міністра аховы здароўя Алена БОГДАН** выказала меркаванне, што наша краіна выйшла на так званае плато. Пра гэта яна расказала ў праграме «Стоп COVID-19. #Праверана_на_сабе».

— Вы ведаеце, што апошнім часам мы выходзім на так званае плато, калі выяўляем у сярэднім каля 8,7-9,7 % ад колькасці праведзеных тэстаў. І каля ўзяць нашу дыяграму, то мы на плато ўзабраліся і знаходзімся там, — сказала намеснік міністра.

Яна засяродзіла ўвагу на тым, што ў нашай краіне абралі стратэгію, калі тэсціруюцца кантакты першага ўзроўню і людзі з падазрэннем на каранавірусную інфекцыю.

— Мы тэсціруем не толькі тых, хто звярнуўся ў нашу сістэму аховы здароўя, у прыватнасці, тых, хто трапіў з цяжкімі пнеўманіямі і цяжкімі станамі. Мы максімальна тэсціруем насельніцтва, калі ёсць падставы меркаваць, што чалавек можа быць інфіцыраваны. Часам абследуецца да дзясятка кантактных асоб захварэлага. І сярод іх мы па-ранейшаму знаходзім да 64 %. Абследуючы і ізалюючы кантакты, мы не дапускаем лавінападобнага росту захваральнасці, — растлумачыла Алена Богдан.

Па колькасці тэстаў, якія праводзяцца ў пераліку на адзін мільён насельніцтва, наша краіна займае другое месца ў СНД і знаходзіцца побач з такімі краінамі, як ЗША, Вялікабрытанія, Канада.

Што датычыцца прагнозаў, то **намеснік галоўнага ўрача па эпідэміялогіі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына ГЛІНСКАЯ** паведаміла, што, магчыма, да канца бягучага месяца, а ў чэрвені дакладна захваральнасць пойдзе на спад.

**Алена КРАВЕЦ.**

Рука дапамогі

## У Беларусі стартуе «Тыдзень дабра»

**Дабрачынныя мерапрыемствы адбудуцца ў краіне з 15 да 22 мая. Яны пройдуць у час круглагадовага рэспубліканскага праекта «Мы выбіраем дапамогу пажылым людзям». Ва ўсіх кутках краіны ўдзельнікі валанцёрскага руху БРСМ «Добрае сэрца» акажуць адрасную бязвыплатную дапамогу адзінока пражываючым пажылым людзям.**

Клопатам і ўвагай хлопцы і дзяўчаты акружаць ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і працы, інвалідаў I і II групы. Валанцёры выканаюць заяўкі ад бабуль і дзядуляў па добраўпарадкаванні прысядзібных тэрыторый, кветнікаў, пасадцы бульбы, колцы дроў, дапамогуць прыбраць у жыллі, памыюць вокны, вынесуць смецце.

Акрамя таго, працягваюць работу гарачыя маладзёжныя лініі. Тэлефоны абласных гарачых ліній: у Брэсце — 8 (0162) 2-11-591, Віцебску — 8 (0212) 6-62-087, Гомелі — 8 (0232) 5-63-315, Гродне — 8 (0152) 7-19-833, Магілёве — 8 (0222) 7-66-782. У буйных гарадах Мінскай вобласці: Салігорску — 8 (0174) 2-00-345, Слуцку — 8 (01795) 7-50-80, Маладзечне — 8 (0177) 7-49-501. У Мінску тэлефон гарачай лініі — 8 (017) 284-85-54.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


**ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ»**

(220108, г. Минск, ул. Казинца, 121А, комн. 327, тел. 8 (017) 398-20-40, www.integral.by)

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОДАЖЕ Б/У ОБОРУДОВАНИЯ:**

| Наименование | Стоимость с учетом НДС, бел. руб. |
|---|---|
| 1. Пресс-ножницы комбинированные НВ5222Б01, б/у, 1990 г. вып., инв. № 02255 | 2 496,00 |
| 2. Станок токарно-винторезный ИЖ-1И611П, б/у, 1976 г. вып., инв. № 56367 | 2 616,00 |
| 3. Станок вертикальный 6Т-13-1, б/у, 1988 г. вып., инв. № 93303 | 6 936,00 |
| 4. Универсальный фрезерный станок 6Т-80, б/у, 1989 г. вып., инв. № 96428 | 2 196,00 |
| 5. Токарно-револьверный станок УТ16ПМ, б/у, 1987 г. вып., инв. № 88925 | 4 068,00 |
| 6. Пресс И1020, б/у 1990 г. вып., инв. № 01449 | 3 120,00 |
| 7. Вертикально-фрезерный станок ВМ-127, б/у, 1982 г. вып., инв. № 67237 | 9 516,00 |
| 8. Вертикально-сверлильный станок 2Н125Л, б/у, 1983 г. вып., инв. № 68801 | 1 236,00 |

Указанная стоимость действует до 25.05.2020 г., условия оплаты – предоплата 100 % стоимости оборудования.

**Полный перечень оборудования, подлежащего отчуждению путем прямой продажи, размещен на сайте www.integral.by (раздел «О КОМПАНИИ/Реализация б/у оборудования»).**

Контактное лицо: Сак Ольга Валерьяновна, тел.: 8 (029) 751-10-00, 8 (017) 398-65-47, e-mail: osak@integral.by.

УНП 100386629

Повестка дня внеочередного общего собрания акционеров ОАО «Полесьежилстрой» 22.05.2020 г.:

1. О совершении сделок общества.
2. О переизбрании членов наблюдательного совета.

Наблюдательный совет.

УНП 200050191

Блізкая ўлада

# Абяцалі кватэру... і перадумалі

**Асфальтаванне дарог, рамонт жылога фонду, датэрміновы выхад на пенсію, выдзяленне жылля, узаемаадносіны з суседзямі і іншыя пытанні прагучалі падчас прамой тэлефоннай лініі, якую правёў памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінскай вобласці Ігар ЯЎСЕЕЎ.**

Карына Уладзіміраўна з сям'ёй жыве ў аграгарадку Лясны Мінскага раёна ў невялікім пакоі інтэрната калідорнага тыпу. Жанчына працуе ў шпіталі для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны медыцынскай сястрой, цяпер яна ў дэкрэтным адпачынку, муж — сантэхнік у гэтай жа ўстанове. У сярэдзіне красавіка шпіталю выдзелілі шэсць кватэр у новым інтэрнаце сямейнага тыпу, пабудаваным для медыкаў у вёсцы Лескаўка. Заяўніца стаяла шостай у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў, але засталася ні з чым.

Ігар Яўсееў запэўніў Карыну Уладзіміраўну, што разбярэцца з гэтым пытаннем і дасць ёй матываваны адказ. Пасля ён расказаў журналістам, што вёў размеркаванне квоты па выдзяленні жылля Мінскай абласной і Мінскай раённай бальніцам, а таксама анкалагічнаму цэнтру ў Бараўлянах у гэтых двух інтэрнатах. Гэта прыгожыя камфартабельныя дамы, якія ўрачыста адкрываў кіраўнік дзяржавы. «Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка даў мне даручэнне ўзяць размеркаванне кватэр пад асабісты кантроль. Да сённяшняга дня скаргаў не было, хоць я туды рэгулярна наведваўся. Я ўважліва вывучу пытанне: колькі работнікаў шпіталя стаіць на чарзе, у якой паслядоўнасці давалі жыллё. І вывад зробім на аснове дзеючага заканадаўства».

Аляксандр Загрыцын з Салігорска расказаў, што ў доме правялі капітальны рамонт. У падвале, а яго кватэра на першым паверсе якраз над ім, паставілі помпы для падагрэву вады. Цяпер у памяшканні немагчыма жыць — шумна. Мясцовыя ўлады прапанавалі яму кватэру ў іншым доме, а затым перадумалі. Маўляў, будзем праводзіць пусканаладачныя работы, каб знешыць шум. Воз, як кажуць, тут да сённяшняга дня.

Ігар Яўсееў возьме пытанне на асабісты кантроль.

— Трэба паглядзець, ці ўсё зроблена ў гэтым тэхнічным памяшканні, дзе ўстаноўлены помпы. Выедзем на месца. Разбяромся, чаму органы дзяржаўнай улады не выдзелілі жыллё, калі абяцалі», — адзначыў Ігар Яўсееў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# Ад дарог да прыбораў аўтаматычнага кантролю

**Пытанні, якія турбуюць жыхароў Магілёўскай і Віцебскай абласцей, будуць уважліва разгледжаны.**

Хоць на дварэ быў будні дзень, тэлефон прамой пятнічнай лініі не змаўкаў. Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці Аляксандр Субоцін выслухаў у гэты дзень 24 жыхароў Магілёўскай і Віцебскай абласцей. Таццяна Рыгораўна, напрыклад, патэлефанавала з Оршы. Жанчына паскардзілася, што да вёскі ў Шклоўскім раёне, дзе яна мае дом, стала не дабрацца. У сувязі з каранавірусам адменены рэйсы аўтобусаў Віцебск—Бабруйск і Полацк—Гомель. Няма прамога рэйса і са Шклова. Даводзіцца дабірацца 5-7 кіламетраў пешшу. Падчас прамой лініі прадстаўнік «Магілёўаблтранса» паабяцаў разгледзець варыянт арганізацыі маршрута са Шклова, бо на міжгародніх рэйсах на 50 % упалі аб'ёмы перавозак і перавозчыкі не жадаюць цярпець страты.

Пра тое, што пачаўся дачны сезон, сведчыла мноства зваротаў накont дарожнага пакрыцця. Толькі за паўгадзіны заяўнікі з Магілёўскага раёна тройчы прасілі зрабіць асфальт у населеных пунктах, дзе яны маюць нерухомасць.

Па дапамогу звярнулася жыхарка Быхава, якая з 70-х гадоў мінулага стагоддзя жыве ў бараку пасляваеннага перыяду пабудовы. У доме працякае дах, але ўлады, кажа яна, слаба рэагуюць. Часовыя рамонты не ратуюць — дах як цёк, так і цячэ.

Жыхары дома па бульвары Непакораных з Магілёва трапілі ў непрыемную сітуацыю. Жыллёва-камунальная арганізацыя, якая іх абслугоўвае, зрабіла, як сцвярджаецца, без згоды жыльцоў рамонт у пад'ездзе. Мала таго што людзей не задавальняе яго якасць, дык яшчэ з іх пачалі ўтрымліваць грошы. Па словах прадстаўнікоў аблвыканкама, якія бралі ўдзел у рабоце прамой лініі, ужо паступаюць падобныя скаргі і з іншых дамоў, якія абслугоўвае гэтая арганізацыя.

Не абышлося і без набалелага пытання накont прадпрыемстваў СЭЗ «Магілёў», якія знаходзяцца побач з аграгарадком Вейна і вёскай Навасёлкі ў Магілёўскім раёне. Жыхар Навасёлак паскардзіўся, што ў паветры часта пахне фармальдэгідам і перыядычна чуваць шум ад працуючага абсталявання. Ён нагадаў, што прадпрыемствы абяцалі ўстанавіць прыборы аўтаматычнага кантролю, каб гэтыя моманты фіксавался.

Заяўнікаў таксама хвалявалі пытанні накont зарплаты, узаконьвання зямельных участкаў, зносу дрэў пад паркоўку і іншыя. Жыхарка Кіраўскага раёна паскардзілася на парушэнні, з якімі працуе прыватнае прадпрыемства па суседстве з яе домам. Сярод асноўных прэтэнзій — пастаянныя выкіды забруджвальных сродкаў у атмасферу, шумная работа абсталявання.

Усе пытанні ўзятыя на кантроль і прынятыя да разгляду. «Не заўсёды людзі, якія звяртаюцца па дапамогу, кажуць праўду, — адзначыў напрыканцы прамой лініі Аляксандр Субоцін. — Не сакрэт, што ёсць катэгорыя грамадзян, якая скардзіцца прафесійна і не раз. Але ёсць людзі, што рэальна чакаюць дапамогі, часам іх па той ці іншай прычыне не чуюць. Таму мы да кожнага з 24 чалавек, якія патэлефанавалі на прамую лінію, дойдзем, дэталёва вывучым іх праблемы, і, чым зможа, дзяржава ім дапаможа». Дарэчы, гэта была першая прамая лінія, якую Аляксандр Субоцін правёў на пасадзе памочніка Прэзідэнта — інспектара па Магілёўскай вобласці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Фінансы

# ІНФЛЯЦЫЯ СЁЛЕТА БУДЗЕ Ў ДЫЯПАЗОНЕ 5-6 ПРАЦЭНТАЎ

**Аб гэтым заявіў старшыня праўлення Нацыянальнага банка краіны Павел КАЛАУР на анлайн-брыфінгу.**

## ПАСКАРЭННЕ ІНФЛЯЦЫІ — ЧАСОВАЯ З'ЯВА

У І квартале гэтага года інфляцыя паскорылася. Гэта факт. Шмат у чым ён звязаны з неспрыяльным уздзеяннем знешніх фактараў, лічыць кіраўнік Нацбанка. На фоне зніжэння сусветных цэн на нафту і курса расійскага рубля адбылося намінальнае паслабленне нацыянальнай валюты. Ва ўмовах пандэміі і ўвядзення за мяжой каранцінных мер на ўнутраным рынку Беларусі павысіўся попыт на прадукты харчавання працяглага захоўвання і тавары першай неабходнасці. Пагоршыўся эканамічны настрой, выраслі інфляцыйныя чаканні.

Разам з тым паскарэнне інфляцыі ў пачатку года рэгулятарам ацэньваецца як часовае. У II квартале ўплыў пазначаных фактараў яшчэ працягнецца. Але ўжо ў другім паўгоддзі квартальныя тэмпы росту цэн замарудзяцца і вернуцца да ўзроўню канца мінулага года.

Паскарэнне росту цэн, якое адбылося ў І квартале, адаб'ецца на гадавой інфляцыі на працягу ўсяго бягучага года. Па выніках 2020 года яна прагназуецца ў дыяпазоне 5—6 працэнтаў. Чакаецца, што ўжо ў пачатку наступнага года гадавыя тэмпы росту цэн не будуць перавышаць 5 працэнтаў. Падтрыманню цэнавай стабільнасці будзе спрыяць цэлая сукупнасць дэзынфляцыйных фактараў.

## ДЗЕЛАВАЯ АКТЫЎНАСЦЬ ВЕРНЕЦЦА ТОЛЬКІ Ў ПАЧАТКУ НАСТУПНАГА ГОДА?

У сваёй заяве кіраўнік Нацбанка адзначыў, што «знешнія ўмовы будуць аказваць стрымліваючы ўплыў на інфляцыйныя працэсы».

Сапраўды, умовы функцыянавання сусветнай эканомікі істотна пагоршыліся ў сувязі з пандэміяй. Меры па стрымліванні распаўсюджвання захворвання аказалі негатыўны ўплыў на вытворчую, спажывецкую і інвестыцыйную актыўнасць. Запаволенне сусветнай эканомікі значна скараціла спажыванне сыравінных тавараў і прывяло да істотнага зніжэння цэн на іх.

Нягледзячы на паступовае зняцце абмежавальных мер, аднаўленне дзелавой актыўнасці, як чакаецца, пачнецца бліжэй да канца бягучага года і працягнецца ў 2021 годзе.

Падзенне сусветнага попыту і нізкія цэны на сыравінныя тавары будуць спрыяць запаволенню інфляцыйных працэсаў. У ЗША і краінах еўразоны на працягу двух гадоў чакаецца захаванне інфляцыі на ўзроўні ніжэй за мэтавыя значэнні. У гэтых умовах Федэральная рэзервовая сістэма ЗША і Еўрапейскі цэнтральны банк працягнуць праводзіць мяккай манетарнай палітыкі, у тым ліку за кошт нізкіх працэнтных ставак.

Інфляцыя ў Расіі будзе знаходзіцца блізка ад мэтавых паказчыкаў. Гэтаму ва ўмовах дэзынфляцыйнага ўплыву сукупнага попыту будзе спрыяць заяўленая Цэнтрабанкам Расіі мяккая грашова-крэдытная палітыка. У цэлым за кошт знешніх фактараў і будзе стрымлівацца рост цэн на тавары, што імпартуюцца ў краіну.

## НАШЫ ДАХОДЫ ХУТКА РАСЦІ НЕ БУДУЦЬ

Павел Калаур адзначыў, што праўленнем прагназуецца дэзынфляцыйны ўплыў з боку ўнутранай эканомікі. Што гэта значыць?

Як вядома, вялікая колькасць прадпрыемстваў, у тым ліку малых і сярэдніх, а таксама многія індывідуальныя прадпрымальнікі адчуваюць цяжкасці, звязаныя з вядзеннем бізнесу ў сітуацыі, якая склалася. На прагнозным перыядзе слабы знешні попыт, а таксама нявызначанасць тэрмінаў яго аднаўлення будуць стрымліваць эканамічны рост у краіне.

Як вынік, без эканамічнага росту ніхто не збіраецца штучна павышаць заработныя платы работнікаў, ды і даходы хатніх гаспадарак будуць абмежаванымі. У гэтых умовах чакаецца зніжэнне спажывецкага попыту, а таксама інвестыцыйнай і крэдытнай актыўнасці эканамічных агентаў.



Акрамя таго, сёлета прагназуецца змякчэнне бюджэтнай палітыкі. Гэта будзе звязана з негатыўным уплывам запаволення эканамічнай актыўнасці на прыбытковую частку бюджэту. Ад таго, што часова зачыніліся прыватныя кавярні, крамы і структуры па планаванні вольнага часу, дастаткова сур'ёзныя грошы не паступаюць у мясцовыя бюджэты нашых гарадоў. А ў выніку скарачэнне выдаткаў абмежавана сацыяльнай скіраванасцю бюджэту, а таксама эпідэміялагічнай сітуацыяй. У далейшым па меры аднаўлення эканамічнага росту бюджэтныя аперацыі набудуць нейтральны характар з пункту гледжання ўплыву на інфляцыю, лічыць Павел Калаур.

З боку абменнага курсу не чакаецца праінфляцыйнага ўплыву. А гэта што такое? Калі перакладаць з фінансава-эканамічнай мовы на зразумелую, то спецыялісты рэгулятара намякаюць насельніцтву, што бегчы ў абменнік і купляць там замежную валюту цяпер не варта. «Рэальны курс беларускага рубля застанецца блізкім да свайго раўнаважнага ўзроўню», — упэўнены кіраўнік Нацбанка.

## АДТЭРМІНОЎКА КРЭДЫТАЎ ДАДЗЕНА ПАКУЛЬ НА 1 МЛРД РУБЛЁЎ

Адказваючы на асобныя пытанні, накіраваныя на брыфінг папярэдне, Павел Калаур адзначыў, што беларускія банкі разгледзелі каля 3 тысяч зваротаў з просьбай дазволіць крэдытныя канікулы.

«З іх каля 1600 — ад прадпрыемстваў, а 1250 заяў — ад грамадзян, — адзначыў Павел Калаур. — Пакуль мы ў пачатку шляху, сумы нязначныя. Банкамі дзесьці на 1 мільярд дадзена рэструктурызацыя, прычым у розных формах».

Па назіраннях фінансавага рэгулятара банкі рэагуюць на звароты па рэструктурызацыі пазітыўна, але ёсць і адмовы. «Калі казаць пра юрыдычных асоб, то прычыны адмоў — гэта адсутнасць плацежаздольнасці: няма выручкі ў бліжэйшай перспектыве. Тут трэба праблему вырашаць больш прынцыпова, у тым ліку задзейнічаць інструмент, ухвалены кіраўніком дзяржавы, — гэта гарантыі ўрада, калі трэба падтрымаць непасрэдна работнікаў прадпрыемства ў кароткі перыяд часу», — растлумачыў старшыня праўлення Нацбанка.

Што датычыцца адмоў у крэдытных канікулах насельніцтву, то асноўная прычына — падача дакументаў, якія б пацвярджалі, што чалавек трапіў у складаную жыццёвую сітуацыю. Гэта разглядаецца як аб'ектыўная прычына адмовы. Грамадзяне, якія маюць крэдыты і хочуць атрымаць растэрміноўку, павінны, на думку рэгулятара, больш адказна пры падыходзе ў банк ставіцца да збору адпаведнага пакета дакументаў.

Нацбанк працягне маніторыць сітуацыю з крэдытнымі канікуламі, у тым ліку ў ўплыў давання растэрміновак на крэдытныя рызыкі банкаўскай сістэмы.

## ПАСЛЯ СПАДУ БУДЗЕ РОСТ. КРЭДЫТНЫ

Наогул Нацыянальны банк прагназуе рост крэдытавання насельніцтва ў 2020 годзе на 15 %, паведаміў на брыфінгу намеснік старшыні праўлення Нацбанка Сяргей Калечыц. На яго думку, гэта цалкам нармальны і немалены паказчык.

Ён звярнуў увагу на тое, што ў сакавіку попыт на крэдыты, перш за ўсё на спажывецкія, істотна вырас. Гэта было звязана з негатыўнымі чаканнямі насельніцтва. У красавіку сітуацыя змянілася ў адваротны бок: попыт знізіўся.

Як паведаміў намеснік старшыні Нацбанка, у далейшым не чакаецца значнага павелічэння попыту. Паводле яго слоў, гэта звязана з тым, што, з аднаго боку, ахвотных ўжо ўзялі крэдыты, з другога — банкі ўважліва сочаць за сваімі рызыкамі, звязанымі з крэдытаваннем у цяперашніх умовах.

Павел Калаур дадаў, што рэгулятар ацэньвае рост крэдытных рызык і пакуль не назірае значнага павелічэння долі актываў, якія не абслугоўваюцца. «Ёсць невялікае павелічэнне: калі ў сакавіку доля такіх актываў была 5,33 %, то ў красавіку стала 5,36 %. Мы мяркуем, што дадатковыя крэдытныя рызыкі матэрыялізуюцца трохі пазней, — растлумачыў ён. — Тым не менш гэта не прывядзе да значнага павелічэння актываў, якія не абслугоўваюцца, і ў цэлым банкаўская сістэма ў стане з гэтымі рызыкамі справіцца».

**Сяргей КУРКАЧ.**

# РАДЫЯЦЫЯ НА СЛУЖБЕ Ў МЕДЫКАЎ

## Як ядзерныя тэхналогіі дапамагаюць змагацца з каранавірусам

**Пра карысць ядзернай медыцыны — дыягностыкі і лячэння з дапамогай радыефармацэўтычных прэпаратаў — вядома даўно. Найчасцей яна прымяняецца ў анкалогіі, кардыялогіі і неўралогіі. З дапамогай дыягностыкі шляхам пазітронна-эмісійнай тамаграфіі выяўляюць, напрыклад, ачагі захворванняў накшталт хвароб Альцгеймера і Паркінсона, знаходзяць ракавыя новаўтварэнні, даследуюць іх актыўнасць і метабалічныя змены. Радыеактыўным ёдам паспяхова лечаць рак шчытападобнай залозы. Ядзерныя тэхналогіі выкарыстоўваюцца таксама ў вытворчасці медыцынскага рэнтгенабсталявання, для стэрылізацыі медсістэм, а яшчэ яны аказаліся незаменным памочнікам у барацьбе з каранавірусам. Як гэта адбываецца, наколькі небяспечная радыяцыя для арганізма і чаго чакаць ад мірнага атама ў будучыні, карэспандэнту «Звязды» расказалі спецыялісты.**



Фота Юліі МАЦКЕВІЧ.

**Уладзімір ЛІНЁЎ, генеральны дырэктар Adani, і Алёна ЛІНЁВА, выканаўчы дырэктар кампаніі, каля апарата КТ VENTUM.**

### СТЭРЫЛІЗАЦЫЯ ЭЛЕКТРОНАМІ

У Беларусі працуюць два аддзяленні ядзернай медыцыны і 20 радыеізатопных лабараторый. Штогод праводзіцца каля 70 тысяч дыягнастычных радыенуклідных даследаванняў, звыш дзвюх тысяч пацыентаў атрымлівае прамянёвую тэрапію радыеактыўнымі прэпаратамі адкрытага тыпу.

А ва ўмовах пандэміі ядзерная медыцына прапанавала такую запатрабаваную тэхналогію, як стэрылізацыя медыцынскіх вырабаў — знішчэнне хваробатворных мікраарганізмаў, спор, вірусаў — з дапамогай паскораных электронаў.

***— Спецыялісты сведчаць, што дэзынфекцыя медвырабаў і абсталявання з дапамогай паскораных электронаў робіць працэс больш экалагічным і хуткім у параўнанні з іншымі спосабамі стэрылізацыі. У чым асаблівасць?***

*— Наш метад вылучаецца тым, што патокі паскораных электронаў, якія генерыруюцца, пранікаюць скрозь упакоўку прадукцыі і не пашкоджваюць яе. Гэта выключае далейшае забруджванне і робіць стэрылізаваную такім чынам прадукцыю прыдатнай для неадкладнага выкарыстання. Таму не трэба наступная дэгазацыя ці іншыя дзеянні, як у выпадку звычайнай стэрылізацыі,* — растлумачыла **Юлія КУРАШВІЛІ, анколаг, дарадца гендырэктара кампаніі «Русатам Хэлскеа» (Rusatom Healthcare).** — *Акрамя таго, падчас такой стэрылізацыі адсутнічае пабочнае хімічнае і іншае забруджванне.*

Усё тэхналагічнае абсталяванне для радыяцыйнай стэрылізацыі робіцца прадпрыемствамі дзяржкарпарацыі «Расатам», а дэзынфекцыя медыцынскага абсталявання і экіпіроўкі з дапамогай паскораных электронаў рэалізавана на яго даччыным прадпрыемстве «Стэрыён». Яно сёння стэрылізуе не толькі медыцынскія маскі, але і лабараторныя сістэмы для забору біяматэрыялу і яго наступнай транспарціроўкі ў лабараторыі, якія спецыялізуюцца на даследаванні COVID-19.

### ТАМОГРАФ ДЛЯ СКРЫНІНГУ І СТАНДАРТЫ ДЛЯ ВІРУСАЎ

Дапамогу медыкам у час пандэміі аказваюць усе нераўнадушныя. У іх ліку і навукова-вытворчае прадпрыемства Adani, якое выпускае медыцынскую тэхніку і сістэмы бяспекі і распрацоўвае тэхналогіі ў галіне лічбавай візуалізацыі медыцынскага рэнтгенаўскага адлюстравання і сістэм рэнтгенаўскага агляду і неразбуральнага кантролю. Супрацоўнікі кампаніі вырабілі больш за 1500 шчыткоў для абароны медыкаў. Тым не менш **дырэктар кампаніі Уладзімір ЛІНЁЎ** лічыць гэта кропляй у моры і простым чалавечым водгукам сваіх работнікаў на патрэбы ўрачоў і тую сітуацыю, якая склалася ў краіне.

***— Каб пераадолець каранавірусную інфекцыю, неабходны прынцыпова новыя тэхналогіі. Ці зроблены ўжо такі выратавальны рывок?***

*— Адзін з асноўных кірункаў, якія сёння важныя для медыцыны, — гэта дыягностыка ўскладненняў, якія выклікае каранавірус. Напрыклад, на нашых лічбавых флюарографах «Пульмаскан», якіх сёння ў паліклініках краіны працуе каля 350, вырашаецца задача скрынінгу (абследаванняў асоб без сімптомаў) органаў грудной клеткі для ранняй дыягностыкі туберкулёзу. Штогод абследуецца каля 2,5 мільёна беларусаў, і аднachасова пры гэтым выяўляецца каля 15-20 іншых захворванняў, у тым ліку пнеўманіі. І гэта ўнікальная магчымасць цяпер ва ўмовах каранавіруса хутка ўбачыць, ці ёсць запаленне лёгкіх. А паколькі гэтая сістэма нізкадозавая ў плане радыяцыйнага ўздзеяння, дык рабіць даследаванні можна шмат разоў на год,* — расказаў Уладзімір Лінёў. — *Сёння мы спрабуем палепшыць гэты метад, каб адразу знаходзіць спецыфічнае запаленне лёгкіх, выкліканае COVID-19, з дапамогай камп'ютарнай тамаграфіі. Такое абсталяванне цяпер выключна актуальнае для барацьбы з масавымі захворваннямі. — Новыя выклікі — гэта, безумоўна, і новыя рашэнні: і ў стэрылізацыі, і ў прымяненні радыяцыйных тэхналогій. Думаю, з'явіцца цэлы пул новых арыгінальных даследаванняў у дачыненні менавіта да вірусаў і іх паводзін. Да гэтага года стандарты да медвырабаў датычыліся выключна хваробатворных мікраарганізмаў і спор. А вось адносна вірулентных вірусаў і рэжымаў апраменьвання медвырабаў патрэбны паглыбленыя статыстычныя даследаванні. Тым больш што медыцынская прадукцыя пастаянна ўдасканальваецца і мяняецца, як, дарэчы, і вірусы. Таму спецыялістам стэрылізацыі неабходна заўжды быць на крок наперадзе,* — упэўнена Юлія Курашвілі.

### КАЛІ КАРЫСЦЬ ПЕРАВЫШАЕ РЫЗЫКУ

Калі да вас прыйшоў пацыент і вы думаеце, ці трэба праводзіць даследаванні, напішыце два радкі: «Што я буду рабіць, калі даследаванне дасць станоўчы вынік?» і «Што я буду рабіць, калі даследаванне дасць адмоўны вынік?» Калі дзеянні ў абодвух выпадках аднолькавыя, значыць, неабходнасці ў дыягностыцы няма. Гэты вядомы ў асяродку ўрачоў анекдот мае непасрэднае дачыненне да жыцця, асабліва калі размова ідзе пра дыягностыку з выкарыстаннем радыяцыі. Нават у заканадаўчых актах прапісаны тры прынцыпы радыяцыйнай бяспекі, якія няўхільна выконваюцца: аптымізацыя, нарміраванне і абгрунтаванне. Калі жорсткай неабходнасці ў дыягностыцы няма, яе не робяць.

***— Наколькі бяспечнае выкарыстанне радыяцыі ў дыягностыцы і лячэнні чалавека і як захаваць баланс паміж шкодай і карысцю яе ўплыву на арганізм?***

*— Калі ў чалавека падазрэнне на анкалогію, то праводзіць дыягностыку, каб выратаваць яму жыццё, неабходна. Няма сэнсу ўлічваць рызыку, што калісьці ў будучым гэтае апраменьванне неяк, магчыма, адаб'ецца на яго арганізме, бо дозавыя нагрузкі настолькі малыя, што эфект шкоднага ўплыву малаімаверны,* — запэўніў **Арам АВЕЦІСАЎ, дацэнт кафедры радыяцыйнай медыцыны і экалогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.** — *Доза радыяцыі, якую за год атрымлівае чалавек ад прыроднага радыяцыйнага фону, — у сярэднім 2,4 мілізіверта (мЗв). Для дыягностыкі выкарыстоўваюцца класічныя дазіроўкі, якія адносяцца да паняцця «малыя дозы радыяцыі». Яны ў 100 і болей разоў меншыя, чым ЛД50 — доза, якая выклікае захворванне і ў палове выпадкаў магчымую смерць. Самыя нізкія дозы выкарыстоўваюцца ў сучаснай лічбавай флюараграфіі — яны складаюць 8-10 мікразівертаў (мкЗв). Гэтая лічба меншая за прыроднае ўздзеянне амаль на парадак, так што на такі радыяцыйны ўплыў увогуле не варта звяртаць увагу. Астатнія дозавыя нагрузкі таксама супастаўныя з прыроднымі і нават калі перавышаюць яго, то вельмі не нашмат. Падчас камп'ютарнай тамаграфіі (КТ), напрыклад, тыповыя лічбы знаходзяцца ў межах дзясятка мілізівертаў (мЗв), або 0,01 грэя (Гр). У сучаснай пазітронна-эмісійнай тамаграфіі ў спалучэнні з КТ доза радыяцыі можа дасягаць 20-25 мілігрэй (мГр), аднак і гэтая велічыня далёкая ад той, якая можа нашкодзіць здароўю чалавека.*

### ЖЫЦЦЁ З ВІРУСАМ: ШТО СПАТРЭБІЦЦА ПАСЛЯ ПАНДЭМІІ

***— Чаго чакаць ад ядзернай медыцыны ў найбліжэйшы час, каб справіцца з пандэміяй і прадухіліць новыя хвалі?***

*— Калі пандэмія скончыцца, мяркую, узрасце неабходнасць у даследаваннях стану розных органаў і сістэм у пацыентаў, якія перанеслі COVID-19. Цяжкія і сярэдняцяжкія формы захворвання маюць наступствам паліорганную недастатковасць. І менавіта візуалізацыя на падставе ядзерных медыцынскіх тэхналогій і новых радыефармацэўтычных прэпаратаў дасць такія магчымасці,* — выказала меркаванне Юлія Курашвілі.

*— Разам са спецыялістамі нямецкіх і шведскіх кампаній мы распрацоўваем больш простую прыладу, якая дазволіць дыягнаставаць спецыфічную пнеўманію, выкліканую каранавірусам. Спадзяюся, што ўжо ў верасні мы зможам прадставіць для выпрабаванняў абсталяванне, якое дазволіць больш танна і проста вырашаць праблему COVID-19, і гэта наш унёсак у барацьбу,* — адзначыў Уладзімір Лінёў. — *Сістэмы аховы здароўя многіх краін аказаліся не гатовыя да барацьбы з такім масавым захворваннем. Апошнія дзесяцігоддзі ў медыцыне ўдасканальваліся ядзерна-фізічныя метады дыягностыкі, скіраваныя на выяўленне захворванняў на вельмі ранніх стадыях, з вельмі складаным абсталяваннем. Напрыклад, гама-нож, задача якога — лячэнне пухліны галаўнога мозга. Ствараць падобную апаратуру важна, аднак свет цяпер сутыкнуўся з праявай, пры якой патрэбны іншы падыход. Калі раней вучоным было цікава працаваць над унікальнымі інфармацыйнымі і тэхналагічнымі рэчамі, то цяпер на першы план выйшлі пошукі шляхоў барацьбы з захворваннем, якое раней лічылася банальнай прастудай. Распрацоўшчыкам і вытворцам трэба сфакусіравацца на стварэнні прылад, прасцейшых па сутнасці і даступных для многіх людзей. Запатрабаваным стане метад масавай скрынінгавай дыягностыкі, а медыцына развернецца ў бок рэчаў, якія на першы погляд здаюцца простымі.*

Як вынікае з меркаванняў экспертаў, дыягностыка будзе працягваць арыентавацца на рэнтген з выкарыстаннем прамянёвых метадаў: тамаграфіі і лічбавай рэнтгенаграфіі, так што ядзерная медыцына працягне ратаваць жыцці.

**Ірына СІДАРОК.**

Ноу-хау

# У ДАПАМОГУ — ЛІЧБАВЫ СТЭТАСКОП

## У Мінаблвыканкаме прэзентавалі аўтаматычную сістэму аналізу гукаў лёгкіх

**Lung Pass — партатыўная прылада, якая дазваляе аддалена кантраляваў стан пацыентаў з лёгкім цячэннем COVID-19 і кантактных асоб. Пра гэта БелТА паведамілі ў аблвыканкаме. Стварэнне сістэмы пачалося ў 2017 годзе. Прыладу распрацаваў рэзідэнт Парка высокіх тэхналогій ТАА «Хэлсі Нэтворкс» сумесна з кафедрай пульманалогіі і фтызіятрыі БелМАПА.**

Бесправадны лічбавы стэтаскоп для праслухоўвання лёгкіх запісвае шумы, хрыпы і іншыя гукі і перадае іх у праграму для смартфона праз Bluetooth. Гукі апрацоўваюцца і класіфікуюцца ў «воблаку» з дапамогай нейрасеткі. Пасля пацыент праходзіць апытанне: фіксуе ў сябе наяўнасць тэмпературы, хрыпаў, макроты і іншых сімптомаў. Урач можа аддалена перaслухаць гукі і прааналізаваць анамнез за ўвесь тэрмін назірання. Пры выяўленні прыкмет пнеўманіі сістэма паведаміць доктару пра пагаршэнне стану пацыента.

Цяпер сістэму тэсціруюць і дапрацоўваюць. Аднак ужо на гэтым этапе, падкрэсліла **загадчыца кафедры пульманалогіі і фтызіятрыі БелМАПА Алена ЛАПЦЕВА,** карыснасць распрацоўкі не выклікае сумненняў. «Яна добра дыферэнцыруе наяўнасць і лакалізацыю хрыпаў. З яе дапамогай мы ўжо маніторым пацыентаў з мукавісцыдозам. У дачыненні да людзей з COVID-19 сістэма асабліва зручная, бо так іх можна прымаць дыстанцыйна. Больш за тое, калі мы тэсціравалі сістэму па распазнанні аўскультатыўных феноменаў, яна перасягнула ўсе нашы чаканні. У далейшым прылада дазволіць знізіць нагрузку на ўстановы аховы здароўя і ўрачоў», — лічыць Алена Лапцева.

У сваю чаргу, **старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН** расказаў, што ў будучыні лічыць неабходным абсталяваць установы аховы здароўя вобласці прыборамі, якія дазваляюць своечасова лячыць людзей. «За такімі распрацоўкамі будучыня. У Беларусі ёсць Парк высокіх тэхналогій, шмат кампаній і крэатыўных, разумных людзей, якія могуць ісці наперад у розных сферах, у тым ліку ў медыцыне», — заўважыў губернатар.

Сакрэты выхавання

# НА ЗАДВОРКАХ ЖЫЦЦЯ СВАІХ ДЗЯЦЕЙ,

## або За што татам можна паставіць «двойку»?

**Давайце прыгадаем, як выглядае традыцыйны бацькоўскі сход у школе. За партамі сядзяць выключна стомленыя маці, якія пасля заканчэння працоўнага дня паспелі забегчы ў краму і аптэку, вырашыць шэраг бытавых праблем, таму многія на прызначаную настаўнікам сустрэчу спазняюцца. Хтосьці, не дачакаўшыся заканчэння мерапрыемства, просіць прабачэння: трэба бегчы дамоў, бо малое засталося з бацькам, а той наўрад ці з ім справіцца. Або трэба завітаць на сход да яшчэ аднаго свайго дзіцяці, які праходзіць паралельна... А вось з'яўленне бацькі ў школе — гэта сапраўдны подзвіг!**



### ЭПІЗАДЫЧНЫ КАНТРОЛЬ

— Мужчынскага ўплыву ў навучальных установах сёння катастрафічна не хапае. Па-першае, педагогаў-мужчын там можна пералічыць па пальцах, — разважае **член праўлення сталічнага грамадскага аб'яднання «Савет бацькаў», журналіст і блогер Анатоль ШЫРВЕЛЬ.** — Па-другое, уцягнутасць бацькоў у школьнае жыццё свайго дзіцяці застаецца вельмі нізкай. Прыгадайце: ці часта мужчыны ўзначальваюць бацькоўскія камітэты ці хоць уваходзяць у іх? І ці лёгка іх прыцягнуць да пазакласных мерапрыемстваў з дзецьмі?

На рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Мужчыны ў адукацыі» перспектывы ўзаемадзеяння бацькоў са школай сталі асобнай тэмай для дыскусіі. Трэба заўважыць, што Анатоль Шырвель разам з жонкай выхоўвае шасцёра дзяцей — старэйшым двайняткам ужо 17 гадоў: дачка заканчвае школу, а сын навучаецца ў паліграфічным каледжы. Таксама ў сям'і ёсць сын-дзевяцікласнік, дзевяцігадовая дзяўчынка і яшчэ двое дзяцей пойдуць у першы клас сёлета.

**Удзел бацькі абараняе дзяцей ад рызыкоўных паводзін, якія вядуць да правапарушэнняў і спажывання падлеткамі псіхаактыўных рэчываў.**

— У мяне восем бацькоўскіх чатаў, таму, паверце, я вельмі добра ведаю ўсю праблематыку знутры, — усміхаецца суразмоўнік. — Пераважная колькасць мужчын сваю ролю ў сям'і ўспрымаюць як ролю карміцеля, і іх удзел у выхаванні часцяком абмяжоўваецца эпізадычным кантролем над дзецьмі, рэдкімі гутаркамі з імі, асобнымі даручэннямі і мараламі. Мужчыны ў значна меншай ступені, чым маці, знаходзяцца ў курсе школьных спраў свайго дзіцяці. Наша грамадскае аб'яднанне правяло апытанне 254 бацькоў, якія выхоўваюць дзяцей ва ўзросце ад 7 да 18 гадоў, каб высветліць рэальную карціну ўцягнутасці татаў і мам у школьнае жыццё.

83 працэнты апытаных паведамілі, што яны не бачаць сэнсу ў бацькоўскіх сходах. Толькі 39 працэнтаў прыходзяць на іх добраахвотна, а 61 працэнт лічыць, што бацькоў прымушаюць хадзіць туды, тлумачачы гэта адміністрацыйным ціскам. 48 працэнтаў бацькоў ідуць у школу, каб атрымаць інфармацыю пра сваё дзіця і задаць пытанні, якія іх цікавяць, але 91 працэнт апытаных канстатуюць, што не чуюць там нічога істотна новага і цікавага для сябе.

На пытанне «Як вы думаеце, у пытаннях узаемадзеяння з бацькамі ў чым зацікаўлена школа?» адказы размеркаваліся наступным чынам. «Школы зацікаўлены ў фінансах» — так адказалі 78 працэнтаў апытаных, «...у здачы макулатуры» — 41 працэнт, «...у іншай матэрыяльнай дапамозе» — 30 працэнтаў, «іх хвалююць пытанні, звязаныя з дрэннымі паводзінамі і паспяховасцю дзяцей» — 16 працэнтаў.

А чаго чакаюць бацькі ад узаемадзеяння са школай? «Што у дзіцяці будзе добрая паспяховасць» — 81 працэнт, «дапамогі ў прафесійнай арыентацыі дзяцей» — 44 працэнты, «дапамогі ў выхаванні дзяцей, у тым ліку інфармавання аб метадах выхавання» — 42 працэнты, «занятасці дзяцей у школе, пакуль бацькі працуюць» — 38 працэнтаў. Але ці супадаюць іх чаканні з тым, што дае школа ці што яна хацела б даць?

### БАЦЬКА-НЕВІДЗІМКА

Між іншым, індэкс уцягнутасці бацькі ў жыццё дзяцей складае ў нашай краіне ўсяго 4 працэнты. Менавіта такую колькасць часу цягам дня сярэднестатыстычны беларускі тата прысвячае сваёй ролі: гэта могуць быць сумесныя заняткі спортам, чытанне, прыём ежы, купанне малога, дапамога ў выкананні дамашняга задання і гэтак далей — працэй кажучы, час, праведзены разам, і меркаваная даступнасць бацькі для дзіцяці. Фактычна дзеці растуць у атмасферы «сацыяльнай безбацькоўшчыны», калі тата адсутнічае ў іх жыцці, нягледзячы на сваю фізічную прысутнасць у доме.

— З усіх малых гэты, здаецца, падобны на майго. Трэба пацікавіцца: як у яго справы? Прыкладна так выглядае ўдзел нашых мужчын у выхаванні дзяцей, — жартуе Анатоль Шырвель. — У адказ на пытанне «Што ты робіш з сябрамі?» чуеш: «Мы гуляем...» Але за гэтымі словамі можа хавацца ўсё што заўгодна, таму я стараюся максімальна ўнікаць у жыццё сваіх дзяцей, размаўляць з імі, ведаю імёны і тэлефоны іх сяброў, чым яны займаюцца. Хоць упэўнены, што далёка не пра ўсё я і ведаю.

Падрастаючае пакаленне фарміруецца пад уздзеяннем самых розных фактараў — сацыяльных сетак, масмедыя, поп-культуры, а ўплыў школы і сям'і на падлеткаў пастаянна змяншаецца. Ва ўсім свеце сёння канстатуюць крызіс даверу да школы. Да таго ж назіраецца ярка выражаная тэндэнцыя, калі бацькі імкнуцца перакласці адказнасць за выхаванне на педагогаў — «здаюць» туды сваіх дзяцей, як у камеру захоўвання.

Па выніках апытання, праведзенага грамадскім аб'яднаннем «Савет бацькоў», толькі 11 працэнтаў матуль і татаў маюць поўнае ўяўленне пра школьнае жыццё сваіх дзяцей. 46 працэнтаў заявілі, што трымаюць руку на пульсе паспяховасці, 32 працэнты адсочваюць іх паводзіны. 18 працэнтаў сцвярджаюць, што яны ў курсе стасункаў сына ці дачкі з равеснікамі, але больш за 50 працэнтаў апытаных канстатавалі, што яны не ведаюць пра шкодныя звычкі сваіх дзяцей, іх стасункі з сябрамі і рамантычныя адносіны. Найбольшы ўзровень дасведчанасці і зацікаўленасці ў паспяховай сацыялізацыі дзіцяці прадэманстравалі бацькі, уцягнутыя ва ўзаемадзеянне са школай, — члены бацькоўскіх камітэтаў і бацькі-актывісты.

### МУЖЧЫНСКІ ЎПЛЫЎ

Дарэчы, шматлікія замежныя даследаванні даўно даказалі вялікі ўплыў мужчынскага выхавання на фізічнае, псіхічнае і разумовае развіццё дзяцей. Малыя, у доглядзе якіх удзельнічаюць таты, у шасцімесячным узросце валодаюць большай кагнітыўнай кампетэнцыяй і маюць вышэйшы бал па шкалах развіцця. **Размова з бацькам, у адрозненне ад размовы з маці, характарызуецца большай колькасцю зададзеных пытанняў**, што патрабуе ад дзіцяці камунікатыўных навыкаў, падштурхоўвае больш размаўляць, выкарыстоўваць разнастайны слоўнікавы запас і складаць разгорнутыя выказванні.

Дзеці зацікаўленых бацькаў вылучаюцца лепшай паспяховасцю і стараннасцю ў школе, маюць больш развітыя маўленчыя навыкі, адчуваюць важнасць адукацыі і надаюць большае значэнне вучобе. Ступень удзелу таты ў жыцці дзіцяці да дасягнення ім сямігадовага ўзросту прадвызначае ўзровень яго адукаванасці ў 20 гадоў. Нават **простая прысутнасць бацькі пры рабоце над хатнім заданнем павышае паспяховасць школьніка на 20 працэнтаў.**

Дзеці, чые таты ўдзельнічалі ў іх доглядзе, больш да іх прывязаны, лепш спраўляюцца з нечаканымі сітуацыямі, больш устойлівыя да стрэсаў, упэўненыя і стабільныя, яны цікаўныя і імкнуцца вывучаць навакольны свет, больш знаходлівыя і ўмелыя. Бацьку лягчэй адпусціць сітуацыю, пайсці на рызыку, гуляць, не задумваючыся аб чыстых штанах, дрэнным надвор'і і здзіўленых поглядах навакольных.

Удзел бацькі ў выхаванні станоўча адбіваецца на эмацыянальным стане і зніжае рызыку развіцця дэпрэсіі. Такія дзеці лепш кіруюць сваімі эмоцыямі і імпульсамі, дэманструюць больш самакантроль, ініцыятыву, лідарскія навыкі, сканцэнтраванасць на дасягненні мэты і здольныя самі сябе матываваць.

Маладыя людзі, чые бацькі былі ўцягнутыя ў іх жыццё ў падлеткавым узросце, вылучаюцца высокай самаацэнкай, асабістай і сацыяльнай адаптацыяй, яны з большай імавернасцю дасягнуць поспеху ў прафесійнай кар'еры і захаваюць сваё псіхічнае здароўе. Дзеці ўцягнутых тат часцей маюць добрыя ўзаемаадносіны з равеснікамі, яны папулярныя і любімыя ў сваім асяроддзі, іх кантакты з аднагодкамі характарызуюцца меншай колькасцю негатыву, агрэсіі, канфліктаў, большай узаемнасцю, пазітыўнымі сяброўскімі стасункамі.

Удзел бацькі абараняе дзяцей ад рызыкоўных паводзін, якія вядуць да правапарушэнняў і спажывання падлеткамі псіхаактыўных рэчываў. Дзеці несвядома капіруюць менавіта сваіх татаў. Тыя сваімі паводзінамі, а не натацыямі выхоўваюць сапраўдных мужчын: сумленных, адказных, надзейных. А дзяўчынкі, якія выраслі з клапатлівым бацькам, будуць дакладна ведаць, чаго хочуць ад жыцця, і абавязкова будуць шчаслівыя ў шлюбе.

Самым моцным фактарам, які ўплывае на высокі ўзровень эмпатыі ў адносінах паміж дзецьмі і дарослымі, з'яўляецца ўцягнутасць бацькі ў жыццё сына або дачкі ў дзіцячым узросце. Менавіта бацька адказны за фарміраванне ў іх маральных каштоўнасцяў.

### МІНІМУМ І МАКСІМУМ

— Педагогі ведаюць, што калі з бацькамі вучня будзе наладжана ўзаемадзеянне, гэта сур'ёзна адаб'ецца на яго паводзінах і паспяховасці, аднак на бацькоўскія сходы, асабістыя сустрэчы і кансультацыі прыходзяць пераважна матулі. Ёсць меркаванне, што з жанчынамі ўзаемадзейнічаць прасцей, але ў гэтым выпадку настаўнікі ідуць шляхам найменшага супраціўлення. **Татаў абавязкова трэба ўцягваць у школьнае жыццё.** Так, іх цяжэй даклікацца, цяжэй да іх дастукацца і знайсці з імі агульную мову, аднак калі гэта атрымаецца, то **эфект будзе намнога мацнейшы,** — запэўнівае шматдзетны бацька Анатоль Шырвель. — Мужчынам часам прасцей адстойваць правы дзіцяці і не пераходзіць мяжу. Напрыклад, выслухаць заўвагі настаўнікаў на бацькоўскім сходзе і пераканаць іх ставіцца да дзіцяці як да асобы. Вопыт работы нашай арганізацыі паказвае, што прыклад татаў, уцягнутых у арганізацыю экскурсій, паходаў, спартыўных і валанцёрскіх мерапрыемстваў, вельмі важны для дзяцей як у сацыяльным плане, так і ў плане агульначалавечых адносін.

Члены грамадскага аб'яднання «Савет бацькаў» распрацавалі стратэгію «О4». Гэта як цвёрдая формула кіслароду: яна ўключае ў сябе «осмысленное, осознанное, ответственное отцовство».

«Савет бацькаў» і сацыяльна-асветніцкая ўстанова «Бацькоўства» прапануюць некалькі праграм, скіраваных на паляпшэнне ўзаемадзеяння сям'і і школы. Па-першае, гэта трэнінгі па навучанні сацыяльных педагогаў, класных кіраўнікоў і дырэктараў устаноў адукацыі найноўшым методыкам правядзення бацькоўскіх сходаў (заўважана, што пасля такіх мерапрыемстваў бацькі павышаюць сваю актыўнасць на 25 працэнтаў).

Другі кірунак — стварэнне клубаў або саветаў бацькаў ва ўсіх школах сталіцы, а потым і ўсёй краіны і актыўны ўдзел апошніх у грамадскім жыцці школы, мікрараёна і двара.

**Фактычна дзеці растуць у атмасферы «сацыяльнай безбацькоўшчыны», калі тата адсутнічае ў іх жыцці, нягледзячы на сваю фізічную прысутнасць у доме.**

Цяпер тэсціруецца курс «50 жыццёва важных звычак бацькі», разлічаны на 56 сустрэч груп зацікаўленых татаў. Многія бацькі кажуць, што не ведаюць пра тое, якім чынам на дзяцей уплывае іх прысутнасць ці адсутнасць. Але гэтае няведанне ніяк не змяняе таго факта, што дзіця вырастае без належнага мужчынскага ўплыву. Адна з задач — дапамагчы татам убачыць, даведацца, усвядоміць неабходнасць як мінімум прысутнасці побач з дзіцем, а як максімум — актыўнага і свядомага ўплыву на фарміраванне яго асобы.

Да таго ж СПУ «Бацькоўства» арганізуе шмат семінараў: «Свету патрэбны бацька», «Тры кіты выхавання», «Дзіцячая псіхалогія», «Падары дзіцяці бацьку», «Прэзерватыў на галаву», «Школа жанізкоў», «Лічбавы какаін» і іншыя.

Па выніках работы канферэнцыі было прынята рашэнне аб стварэнні мужчынскага педагагічнага клуба «Настаўнік», галоўным кірункам дзейнасці якога стане павышэнне статусу педагогаў-мужчын.

Таксама ў планах — укараніць праграмы па бацькоўстве ў вышэйшых навучальных установах (спачатку ў якасці факультатыву) і распрацаваць курс палавога выхавання ў сям'і.

— Сексуальныя пытанні заўсёды адносіліся ў нашым грамадстве да закрытай праблематыкі, публічнае іх абмеркаванне не адпавядае нашаму культурнаму коду, — падкрэслівае Анатоль Шырвель. — Таму іх трэба абмяркоўваць у сям'і, у асабістых гутарках з бацькамі, але тыя павінны быць падрыхтаваныя да падобных размоў са сваімі дзецьмі. Таму мы лічым мэтазгодным, каб быў распрацаваны адпаведны курс, а ўстановы адукацыі і іншыя грамадскія аб'яднанні будуць выконваць ролю навучальных цэнтраў для бацькоў, гэта значыць вучыць іх, як тактоўна данесці да дзяцей падобныя пытанні.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 16 (504)

# Уладзімір КАРАЧЭЎСКІ: «Калі я раней у нечым сумняваўся, то цяпер разумею, што адкладваць непазбежнае не мае сэнсу»

**Нацыянальная кінастудыя трапляе ў навіны, нават калі гэта не звязана ўласна з новымі фільмамі, але апошнім часам нагоды для абмеркавання былі сапраўды грунтоўныя. То карціну «Купала» не паказалі беларускай публіцы, то прэм'еру «Авантур Пранціша Вырвіча» перанеслі, то на Берлінале прэзентавалі знятую пры падтрымцы «Беларусьфільма» стужку. Урэшце здарылася пандэмія COVID-19, якая не абмінула нікога, таму мы чарговы раз з'явіліся на кінастудыі, каб распытаць яе дырэктара Уладзіміра Карачэўскага пра ўсё, што адбываецца праз пандэмію, і тое, што мае адбыцца і без яе. Адным словам, надзённае, у тым ліку пакуль не ўбачаны «Купала», — у нашым інтэрв'ю.**




Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

***— Як пандэмія каранавіруса паўплывала на работу «Беларусьфільма»?***

— Вельмі моцна і адчувальна. Кінаіндустрыя ва ўсім свеце пацярпела — спыніліся як вытворчыя працэсы, так і, відома, прасоўванне, продажы, удзел у кінафестывалях. Такога яшчэ ніколі не было. «Беларусьфільм» залежыць ад знешніх сувязяў, мы ж зацікаўлены рабіць кіно не толькі для ўнутранага рынку — нам трэба працаваць з замежнымі партнёрамі, аказваць паслугі і прасоўваць сваю прадукцыю за мяжой. Вясна ў гэтым плане абяцала быць вельмі насычанай, а мы павінны былі добра зарабіць, але ўжо ў сярэдзіне сакавіка адчулі сур'ёзныя змены, калі на кінастудыі спынілася вытворчасць шэрагу замежных фільмаў, перасталі браць за паслугі, і партнёры адмянілі візіты. Самае крыўднае — некаторыя праекты рыхтаваліся два гады. Як вы разумееце, замерла і ўласная вытворчасць — так ці інакш, людзі адмовіліся ад здымак у дакументальных фільмах, а замежныя акцёры не могуць да нас прыехаць. Сёння работу працягваюць толькі аніматары, а большасць праектаў пастаўлена на кансервацыю.

***— Чым кінастудыя займаецца замест таго, што мусіла спыніць?***

— Мы заняліся работай, на якую дагэтуль не заўсёды хапала часу і сіл. Напрыклад, пошукам пакупнікоў і партнёраў для новых фільмаў, а я хачу, каб створаныя за апошнія гады карціны мелі і фестывальную, і пракатную, і тэлевізійную гісторыю. Таксама актыўна працуем над давядзеннем да ладу свайго фонду — у нас цяпер ёсць замежныя сэйлз-агенты, гатовыя прадаваць нашы фільмы, але гэта патрабуе інвентарызацыі бібліятэкі, рэстаўрацыі карцін, падрыхтоўкі субцітраў, а гэта маштабная праца.

***— А што сёння з вашым фінансавым станам?***

— Сур'ёзныя праблемы. Ужо трэці месяц мы знаходзімся ў вельмі няпростай сітуацыі: грашовых паступленняў цяпер няма, пры гэтым «Беларусьфільм» не субсідзіруецца, а з'яўляецца рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам, то-бок павінен зарабляць. Кінастудыя эканоміць на ўсім, час ад часу ідзём у прастой, бярэм адпачынкі за свой кошт, але змагаемся за тое, каб застацца на плаве. Мы падтрымліваем сувязь з партнёрамі — усе яны рвуцца, мараць і жадаюць прыехаць пасля адкрыцця граніц.

***— Мне здаецца, да справакавана каранавірусам крызісу фінансавы стан кінастудыі стаў паляпшацца.***

— Прынамсі, даходы павялічыліся, але давялося панесці і немаленькія выдаткі — афарміць некаторыя звязаныя з рэканструкцыяй дакументы, закупіць тое-сёе абсталяванне, укласці грошы ў некалькі фільмаў і іх прасоўванне. Так, больш актыўна стала працаваць кінафабрыка, павялічыўся прыбытак ад дыстрыбуцыі, сюды прыехалі кліенты, якія ніколі тут не бывалі, — і ў нас з'явіўся нейкі прасвет. Але толькі-толькі мы яго ўбачылі, як каранавірус падарваў усе бізнес-праекты.

***— Некаторы час таму вы сталі скарачаць штат кінастудыі і рэарганізаваць яе структуру. Як усё гэта праходзіць?***

— Гэты год для «Беларусьфільма» будзе пераломны, і ўжо восенню ён будзе працаваць у іншым фармаце. Каранавірус нават падштурхнуў да больш радыкальных крокаў: калі раней я ў нечым сумняваўся альбо нешта шкадаваў рабіць, то цяпер разумею, што адкладваць непазбежнае не мае сэнсу. Кінастудыя сёння сумяшчае вытворчасць і аказанне паслуг, а гэтая мадэль існавання — грувасткая і нежыццяздольная, нездарма такога амаль нідзе не засталося. Гэтыя кірункі трэба развесці, каб яны працавалі паасобку і мелі асобныя фінансавыя патокі. Да таго ж наяўнасць пастаяннага агромністага штату супрацоўнікаў не адпавядае сённяшнім патрабаванням. Я максімальна выводжу людзей па-за штат, скарацілася колькасць начальнікаў, аб'ядналіся некаторыя службы. У нас больш няма галоўнай рэдакцыі і аддзела маркетынгу, затое ёсць прадзюсарскі цэнтр, які мусіць усё гэта аб'яднаць і заняцца ўсім — ад пошуку праекта і стварэння фільма да яго прасоўвання і продажаў.

> **«Як бы мяне ні крытыкавалі, я не магу забяспечыць заробкам такі вялікі штат, эканоміка дыктуе вельмі шмат, і рэагаваць трэба па магчымасці хутчэй».**

***— Людзі не скардзяцца на масавае скарачэнне?***

— Скардзяцца і крыўдзяцца, але што рабіць: як бы мяне ні крытыкавалі, я не магу забяспечыць заробкам такі вялікі штат, эканоміка дыктуе вельмі шмат, і рэагаваць трэба па магчымасці хутчэй. Раней кінастудыя фінансавалася з бюджэту на сто працэнтаў і магла арганізаваць пастаянны вытворчы працэс. Сёння ў мяне то тры фільмы, то ніводнага, і я не магу быць упэўнены, напрыклад, што выйграю ў конкурсе на дзяржзакупку і атрымаю грошы на новую карціну, бо міністэрства сочыць, каб усе гулялі па агульных правілах. Таму я аптымізую кінастудыю, і не толькі творчыя студыі, але і адміністрацыйны персанал. Вядома, ніхто не хоча страчваць пастаяннае месца работы, людзі псіхалагічна да гэтага не гатовы, але і кінастудыя не гатова ўтрымліваць усіх супрацоўнікаў, інакш яна будзе нарошчваць даўгі. То-бок у мяне ёсць выбар: альбо выратоўваць «Беларусьфільм», альбо захоўваць людзей, але і гэта ў рэшце рэшт спыніцца само сабой.

***— Колькі людзей ужо перайшло на новую форму стасункаў з кінастудыяй?***

— З некім мы не працягнулі кантракты, некага перавялі на часовыя працоўныя дамовы, некага вывелі ў прастой і глядзім, колькі людзей у штаце нам трэба. Я думаю, колькасць супрацоўнікаў скароціцца на траціну. Але аптымізацыя праходзіць павольна, я не раблю рэзкіх рухаў, большасці мы прапануем альтэрнатыву. Нехта лічыць мяне разбуральнікам — ну, калі толькі разбуральнікам свядомасці, бо далей так быць не можа.

***— Ці паспелі вы паменшыць даўгі кінастудыі?***

— Даўгоў хапае. Бо грошы, каб нешта зарабіць, даводзіцца ўвесь час у нешта ўкладваць. Самы просты прыклад — кінатурызм: хоць невялікую экспазіцыю, але давялося зрабіць. Тое ж з продажамі: промапрадукцыя, перамантаж, пераагучка, рэстаўрацыя — на ўсё патрэбны грошы. Я ніколі не абяцаў, што фінансавы стан «Беларусьфільма» памяняецца хутка. Затрат і праблем шмат, але я разлічваю на нашы новыя фільмы — усе яны могуць мець добрую пракатную гісторыю.

***— У вас былі даўгі па аплаце работы акцёраў. Вы іх закрылі?***

— Адны закрылі — з'явіліся новыя.

***— Не так даўно шырока абмяркоўвалася тое, што кінастудыя ўдзельнічала ў прадстаўленым на Берлінскім кінафестывалі фільме «Урокі персідскай» Вадзіма Перэльмана, але не скарысталася гэтым, каб прасунуць сябе на кінарынку Берлінале. Вы ездзіце на кінарынкі — наколькі выгада ад удзелу відавочная?***

— Мы пачалі ездзіць на кінарынкі толькі апошні год, і гэта дае вынік — дзе б ні былі, мы паўсюль знаходзілі партнёраў. Намі цікавяцца, да нас у выніку прыязджаюць, нашы фільмы разглядаюцца для куплі. Пакуль што Беларусь з'яўляецца terra incognita для сусветнага кіно, і ў кінарынках нам трэба ўдзельнічаць абавязкова, Міністэрства культуры цяпер прапрацоўвае гэтае пытанне, але ў нас няма досведу такіх паездак, і вучыцца даводзіцца на хаду. Кінастудыя існуе ўжо 95 гадоў, я лічу, мы не горшыя, чым грузінскае, прыбалтыйскае ці румынскае кіно, затое яны актыўна прадаюць свае магчымасці, часам нават больш сціплыя, чым нашы. Канешне, трэба было б выставіцца і на Берлінале, але для гэтага патрэбны немаленькія выдаткі — дваццаць тысяч рублёў і вышэй. На прэм'еру «Урокаў персідскай» я паехаў толькі на пару дзён, жыў у простым гатэлі, але нават на гэта трэба было знайсці грошы. Дарэчы, калі я прыйшоў на «Беларусьфільм», у яго не было ніводнай міжнароднай дамовы, апроч як з Расіяй, — цяпер жа мы супрацоўнічаем з партнёрамі з больш чым дзесяці краін. Хай гэта пакуль маленькі ручай, але пачатак закладзены, кожная паездка дае новыя кантакты: мы сюды, напрыклад, прывезлі індыйцаў, пасля з'ездзілі да іх.

***— Калі вы паспелі пабываць у Індыі?***

— Перад самым каранавірусам з'ездзілі ў Мумбаі, паглядзелі іх натурпляцоўкі, дзе бегаюць малпы, сустрэліся з патэнцыйнымі інвестарамі. Прадстаўнікі кінастудый Індыі плануюць прыехаць сюды, і партнёры, што ў нас ужо здымалі, маюць намер вярнуцца. Вясной мы планавалі і з кітайцамі ўвайсці ў сумесную вытворчасць.

***— Тое, што было запланавана, перанеслася ці нешта ўсё ж адмянілася?***

— Пакуль ніводны замежны праект не кажа пра адмену, толькі пра перанос. Кінаіндустрыя пацярпела, як і турызм, мацней за ўсё. Заказаў няма, паслуг ніхто не бярэ, а заробкі на «Беларусьфільме» залежаць ад таго, колькі ён зарабляе. Мы прашарсцілі паўсюль — усе кажуць пра сур'ёзны крызіс, увесь свет стаіць. Нават тэлеканалы адкладваюць куплю кантэнту, бо ў іх няма рэкламы, а значыць, і грошай. Некаторыя, праўда, прапануюць паказаць нашы карціны, а грошы аддаць потым.

> **«Вясна абяцала быць вельмі насычанай, а мы павінны былі добра зарабіць, але ўжо ў сярэдзіне сакавіка адчулі сур'ёзныя змены».**

***— Не пашкадавалі, што ў свой час перанеслі прэм'еру «Авантур Пранціша Вырвіча»? Бо ў маі, як было запланавана, яна, відавочна, не адбудзецца.***

— Не пашкадаваў, я спадзяюся, у нас атрымаецца зрабіць абяцаную беларускамоўную версію, хоць працэс пакуль не запушчаны. Калі ўсё будзе ў парадку і да 3 ліпеня пачнуць працаваць кінатэатры, спачатку на экраны выйдзе наша карціна «Лёс дыверсанта» Дзмітрыя Астрахана. Гэта ваенны фільм, ён павінен быць да месяца. «Авантурамі» мы, напэўна, адкрыем восень. Некалькі пакупнікоў цяпер разглядаюць «Сляды апосталаў-2», пэўныя інтэрнэт-платформы і расійскія тэлеканалы прэтэндуюць на сіткам «Ілюзіі».

***— А якія ў кінастудыі планы на «Купалу»?***

— На некаторыя буйныя кінафесты, як у Венецыі, Сан-Себасцьяне, Таронта, Пусане, прыём заявак яшчэ не завершаны — можа быць, сусветная прэм'ера «Купалы» адбудзецца на адным з гэтым форумаў, але восенню мы так ці інакш пакажам яго беларускім гледачам, зацягваць не будзем, каб ён не пераспеў.

***— Вы назіралі, якую незадаволенасць у некаторых медыя выклікала тое, што «Купалу» не паказваюць у Беларусі?***

— Калі нехта недачуў ці недачытаў, хай не дадумвае, а прававерыць больш уважліва. Некаторым словаблудным, што не валодалі інфармацыяй, а каціні бочкі

на кінастудыю, я нават адправіў папярэджанні. Я даўно сказаў, што мы плануем адправіць фільм на фестывалі, а ўжо пасля, у другой палове 2020 года, паказаць у Беларусі. Ніхто не абяцаў раней, а фільм між тым пачалі змешваць з нейкімі палітычнымі кампаніямі.

***— Але ж публічны паказ «Купалы» планаваўся ў снежні.***

— Так, для кінасуполкі — на Дзень беларускага кіно, але не ў час лыжка на абедзе: мы не паспелі дарабіць камп'ютарную графіку, а паказваць абы-як не хацелі, бо фільм для нас сапраўды знакавы. Потым мы пагаварылі з тымі, хто займаецца фестывалямі, і вырашылі, што зробім паказ ужо непасрэдна перад прэм'ерай, — цяпер паказваць «Купалу» няма сэнсу.

***— Калі скончылася рэканструкцыя кінастудыі, ішла гаворка пра тое, што тут можна рабіць поўны цыкл вытворчасці фільма. Чаму «Купалу» агучвалі ў Празе?***

— Тонстудыя была, толькі абсталяванне не адпавядала патрабаванням, таму часткова за нашы грошы, часткова пры падтрымцы бюджэту ў 2019 годзе было закуплена новае. Да апошняга ішла настройка, але праз каранавірус спецыялісты былі вымушаны з'ехаць, таму нам яшчэ трэба данастроіць студыю і атрымаць ліцэнзію. Адпаведна, «Купалу» мы вывезлі ў Прагу, а «Авантуры Пранціша Вырвіча» — Вільнюс.

***— Як вы думаеце, у «Беларусьфільма» атрымаецца перажыць сённяшні крызіс?***

— Буду казаць шчыра, сапраўдныя наступствы мы яшчэ адчуем і будзем сядзець з туга зацягнутымі паясамі. Усё ж кінастудыя з'яўляецца адзінай у краіне, таму спадзяюся, што падтрымку ад дзяржавы, калі будзе зусім дрэнна, яна атрымае. Але і мы не сядзім на месцы, а шукаем спосабы застацца на плаве. Па-першае, мы мінімізавалі расходы, па-другое, стараемся працаваць больш гібка і павялічваць даход ад новых форм паслуг, а па-трэцяе, імкнёмся нарэшце рэфармаваць структуру.

***— Памятаю ваш энтузіязм, калі вы сталі кіраваць «Беларусьфільмам», — ён застаўся?***

— Канешне, кінастудыя стала для мяне не работай і не тое каб часткай жыцця, а адной з галоўных мэт — я хачу, каб яна стала паспяховай. Як я казаў у першых інтэрв'ю, гэта не месца, каб перасядзець да наступнай пасады. Я ўспрымаю «Беларусьфільм» як жывы арганізм, калі я прыходжу дадому, у мяне нават не атрымліваецца адключыцца ад работы — я працягваю пра яе думаць, пераживаць, шукаць варыянты, нават прачынаюся па начах. Шчыра прызнаюся, бывае вельмі страшна, але сціснеш зубы і працуеш. Я пагляздеў, як кінаіндустрыя арганізавана за мяжой, і мне здаецца, я на правільным шляху. Вядома, некаторыя рашэнні даюцца па-чалавечы складана, затое шмат вузлоў ужо разблытана.

***— А самі для сябе дзякуючы каранавірусу вы нешта пераасэнсавалі?***

— Канешне, я стаў цаніць простыя чалавечыя радасці — што ты жывеш, ты здаровы, і ў цябе ёсць сілы — і больш уважліва стаўлюся да блізкіх і сяброў. Цяпер я раблю многа званкоў, нават тым, каго не бачыў два-тры гады, — як бы збіраю сваё жыццё і праз гэта зазнаю надзвычай прыемныя эмоцыі. У гэтыя часы трэба радавацца таму, што ты можаш зрабіць, — пагуляць з сынам, паразмаўляць з добрым чалавекам, пачытаць кнігу, пагляздець фільм, выпіць келіх віна. Цяпер нават праблемы вырашаць — шчасце.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

На адкрытай прасторы

# Віртуальная выстава на віртуальнай плошчы



**Гэтай традыцыі ўжо дзевяць гадоў: кожную вясну на сталічнай плошчы Якуба Коласа пад адкрытым небам адкрываецца выстава «Мастак і горад», якую можна прыйсці паглядзець адмыслова альбо зазірнуць на яе незапланавана падчас шпацыру па Мінску. Праўда, калі вы сёння трапіце на плошчу, ніякай экспазіцыі там не знойдзеце: з-за пандэміі каранавіруса штогадовы праект адкрыўся ў анлайн-фармаце, гэта значыць паглядзець выставу пакуль што можна толькі на адмысловым сайце, але і ў віртуальным свеце «Мастак і горад» зманціраваны на сваёй «роднай» пляцоўцы.**

Кожны раз праект мяняецца і прысвячаецца альбо канкрэтнаму аўтару, альбо пэўнай канцэпцыі. За тыя гады, што існуе «Мастак і горад», на плошчы Якуба Коласа былі выстаўлены Марк Шагал, Казімір Малевіч, Мікалай Селяшчук, Валянцін Губараў, Георгій Скрыпнічэнка. У адзін з «выпускаў» размешчаная тут экспазіцыя паказала трыццаць пяць беларускіх авангардыстаў, а летась выстава была прысвечана дзвюм выбітным мастачкам — Зоі Літвінавай і Зоі Луцэвіч.

Тэма «Мастака і горада» сёлета відавочная: у 2020-м, калі Беларусь святкуе стагоддзе віцебскага авангарднага мастацкага аб'яднання УНОВИС, арганізатары вырашылі «абыграць» юбілей і запрасіць да ўдзелу паслядоўнікаў ідэй Казіміра Малевіча. То-бок выстава ўключае ў сябе трыццаць два творы сучасных віцебскіх мастакоў — сябраў аб'яднання «Квадрат», якое можна назваць спадкаемцам сцвярджальнікаў новага мастацтва. Сярод шасняццаці прадстаўленых аўтараў — Аляксандр Малей, Віктар Шылко, Аляксандр Слепаў, Мікалай Дундзін, Валерый Чукін ды іншыя.

Тэма тым больш сімвалічная, што «Мастак і горад» сам па сабе кожны год нагадвае нам Віцебск пачатку 1920-х, бо менавіта УНОВИС паспяхова вывеў мастацтва ў тым ліку на вуліцу, што ў свой час так зачапіла позірк Сяргея Эйзенштэйна.

Наведаць выставу сёння можна на сайце higminsk.by — выглядае яна гэтаксама, як выглядала б на рэальнай плошчы Якуба Коласа. Можна ўважліва разгледзець кожны стэнд і адкрыць «экспанат» у выглядзе асобнай выявы. Апроч гэтага, анлайн-экспазіцыя суправаджаецца аўдыягідам, дзякуючы якому можна даведацца пра кожны з прадстаўленых твораў.

Але замыкацца на анлайн-фармаце праект не збіраецца: калі рэчаіснасць дазволіць, выстава будзе ўсё роўна зманціравана на сваім традыцыйным месцы. Да таго ж пару гадоў таму арганізатары сталі паказваць экспазіцыю ў іншых гарадах краіны, дык вось сёлетні «Мастак і горад», вядома, не можа не трапіць у Віцебск.

**Вольга МІЦКЕВІЧ.**

На сцэне

# ПРЫНЦЫПОВЫ ЗНАЧЫЦЬ НЯДОБРАНАДЗЕЙНЫ

## РТБД ПАКАЗАЎ СВОЙ НОВЫ СПЕКТАКЛЬ ПРАЗ ТРАНСЛЯЦЫЮ

Мне яшчэ ніколі не даводзілася пісаць водгукі на тэатральныя прэм'еры, якія адбыліся анлайн, і, па-добраму, не павінна было давесціся. Але рэальнасць уносіць свае карэктывы таксама ў культуру і культурную журналістыку: Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі ў часы абмежаванняў праз каранавірус вырашыў зладзіць прэм'еру свайго новага спектакля «Профіт» нягледзячы ні на што.

Гэта значыць, акцёры паўнавартасна адрэпеціравалі і адыгралі пастаноўку на сцэне тэатра, а сэрвіс VOKA ў прызначаны час, а сёмай гадзіне 12 мая, паказаў жывую трансляцыю. Некаторыя гледачы, што не вярнулі набытыя ў «здаровы» перыяд білеты, прыйшлі на прэм'еру непасрэдна — ну, да гэтага можна па-рознаму ставіцца. Сапраўды, спектаклі, на якія мы цяпер «ходзім», звычайна паказваюцца ў некалі зробленых запісах, а новы кантэнт ствараецца вэб-камерамі з кватэр выканальнікаў. Так ці інакш, на гонар РТБД трэба сказаць, што, мяркуючы па трансляцыі, пастаноўку «Профіт» варта чакаць у афлайн-фармаце.




Мы ўжо даўно глядзім тэатральныя пастаноўкі на экранах камп'ютараў і жартуем, што прыйшоў час з'явіцца крытыкам трансляцый, якія б ацэньвалі ракурсы здымкі, склейкі і кашаль аператара. У выпадку з «Профітам» можна адзначыць адну, свядомую ці падсвядомую, сапраўдную ці надуманую, якасць мізансцэніравання — вялікія дыстанцыі, што звычайна застаюцца паміж акцёрамі. Мне падабаецца бачыць у гэтым уплыў кавіда, з-за якога ў звычайным жыцці мы стараемся трымацца ад людзей за паўтара метра, што выпрацоўваецца ў асобную звычку.

З іншага боку, пустоты паміж персанажамі лагічныя ў прапанаваным сюжэце, дзе героі па пэўнай прыкмеце дакладна раздзяляюцца на добрых і дрэнных і сімвалічна гэтымі пустотамі размяжоўваюцца. «Профіт» — гэта асучасненае «Даходнае месца» Аляксандра Астроўскага. Мастацкі кіраўнік РТБД Аляксандр Гарцуеў перанёс дзеянне п'есы з XIX у XXI стагоддзе, падладзіў пад сучаснасць мову персанажаў, узяў самакат і бомбер (гэта такі тып моднай курткі) у якасці рэквізіту, прымусіў аднаго з персанажаў танцаваць стрыптыз, а другога здымаць гэта на тэлефон, уплёў у сюжэт настаўніка, што працуе за трыста рублёў, — і атрымаў актуальную для сённяшняй Беларусі гісторыю.

Калі нехта памятае Астроўскага, мы маем справу з прынцыповым маладым чалавекам Васілём Жадавым, які можа папрасіць у высокапастаўленага дзядзькі «даходную» пасаду, а замест гэтага ідзе за сваім сумленнем, шмат працуе і зацірае пра «духоўнае адраджэнне». У «Профіце» ён ездзіць на самакаце, што, пэўна, паказвае, маўляў, зор з неба герой не хапае, і свеціць белай кашуляй і белымі кедамі (дзядзька Жадава свеціць масіўным ланцужком з масіўным крыжом на шыі — увіце Андрэя Дабравольскага).

Амаль усе іншыя персанажы, галоўным чынам спрытны Белагубаў з гадзіннікамі на абедзвюх руках, выступаюць Жадаву антаганістамі, бо маюць супрацьлеглыя погляды на жыццё і намагаюцца хлопца ім навучыць. Тут і дурненькая жонка Васіля Паліна, якая мужа любіць, але бомбераў таксама жадае. На прэм'еры сужэнцаў сыгралі Арцём Курань і Ганна Семяняка, пара ў рэальным жыцці таксама.

Значыць, дабро змагаецца ў спектаклі са злом, дзе апошняе ўвасабляецца ў празе нажывы, выслужванні, страху перад вышэйстаячымі органамі, практычы адкатаў і падстаўленым пад хабар партфелі, што паводле «Профіта» запаланіла ледзь не ўвесь свет. «Лепш быць сытым, чым галодным», — дэкларуе прынцып жыцця адзін з персанажаў. «Браць адкат больш выгадна, чым не браць», — іранізуе ў адказ Жадаў.

І пакуль галоўны герой выбірае высакародную беднасць, а на яго фоне багацеюць і тусуюцца калегі, супрацьлеглыя бакі трапнымі, вартымі цытавання фразачкамі адстойваюць свае ідэі, што прыводзіць да кульмінацыі, у якой нехта мусіць здацца і памяняць сваё меркаванне.

Атрымаўся такі сабе па-добраму дыдактычны спектакль (назва «Профіт» адсылае да папулярнага ў Белагубава слоўца, што значыць «выгада») плюс драма супрацьстаяння большасці. Усё ў прыцемках, з файнымі танцамі і парадай жыць, як жывуць усе «нармальныя» людзі. Але наколькі пастаноўка перабольшвае ці прымяншае сапраўдны стан грамадства, у кожнага, напэўна, будзе сваё меркаванне. Значыць, чакаем паляпшэння эпідэміялагічнай сітуацыі, каб паглядзець спектакль у афлайне.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

## ОАО «МАПИД»

**приглашает всех желающих принять участие в аукционе по продаже бывшей в эксплуатации техники**

Заявление на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, каб. 17, ОАО «МАПИД».

Окончание приема заявлений – 17.06.2020 г. в 13.00.
Более подробная информация об аукционе – на сайте www.mapid.by или по телефону (8-017) 397-57-32.

**Аукцион состоится 17.06.2020 в 14.00 по адресу: г. Минск ул. Р. Люксембург, 205, ОАО «МАПИД», каб. 39.**

- ЛОТ 1: Бетононасос стационарный прицепной CIFA PC 506/309 D/E (2008 г. в., инв. № 9514). Начальная цена – 82 334,57 руб.
- ЛОТ 2: Асфальтоукладчик VOGELE Super 1603-1 (2005 г. в., инв. №1177). Начальная цена – 122 653,64 руб.
- ЛОТ 3: Автокран КС-3577 (2002 г. в., инв. № 1118, на базе МАЗ-5337 зав. № 133). Начальная цена – 17 533,64 руб.
- ЛОТ 4: Электростанция GEKO ED-S/DEDA 200000 (2006 г. в., инв. № 1181). Начальная цена – 30 253,64 руб.

УНП 100008115

## РУП «Институт недвижимости и оценки»
(организатор аукциона)

**информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, переданного ОАО «Торфопредприятие Глинка»** (продавец) **по договору безвозмездного пользования имуществом**

**Лот № 1:** квартира, инв. № 130/D-51355, 51,3 кв. м, 2 комнаты. Адрес: Брестская обл., Пинский р-н, Городищенский с/с, п. Гряды, ул. Центральная, 1-2. **Начальная цена без НДС –** 1 800,00 бел. руб. **Аукцион состоится 17.06.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.** Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по иуществу Республики Беларусь – gki.gov.by.

УНП 190055182

**ООО «Добрый день» предлагает в аренду пищевое оборудование, бывшее в употреблении**

1. Упаковочное оборудование. 2. Смеситель. 3. Пароконвектомат. 4. Аппарат для резки сухофруктов. 5. Шкаф сушильный. 6. Стеллажи. 7. Столы

**Стоимость договорная. Тел./факс +375 17 3694305**

УНП 101293345

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4 этаж паркинга, каб. 27, тел. (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09.

Продавец: **частное предприятие «Универсалторг»** (УНП 700361979) в лице управляющего по делу о банкротстве ИП Ивлева Артема Юрьевича, тел. +375 (44) 558-88-00.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **1 июня 2020 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4 этаж паркинга, каб. 27.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. №714/С-19516 (назначение – здание нежилое, наименование – пристройка бытовых помещений механического цеха) | 31 390,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. №714/С-19515 (назначение – здание нежилое, наименование – бытовые помещения механического цеха ) | 22 575,00 |
| 3 | Капитальное строение с инв. №714/С-17723 (назначение- здание проходной, наименование – проходная ЦТНП) | 7 310,00 |
| 4 | Капитальное строение с инв. №714/С-17722 (назначение – здание механического цеха, наименование – здание механического цеха) | 138 632,00 |
| Местонахождение – Могилевская обл., г. Осиповичи, пос. Советский. | | |

Телефон для ознакомления и осмотра +375 (44) 558-88-00.

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 16.05.2020 г., 09.00, по 29.05.2020 г., 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения, не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты – 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано в газете «Могилевские ведомости» от 03.04.2020 г.

## Извещение о проведении 16 июня 2020 года торгов с условиями по продаже жилых помещений (квартир), принадлежащих ОАО «Минский домостроительный комбинат»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | |
|---|---|---|---|
| № предмета торгов | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Начальная цена, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| 1 | «Квартира 18» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-18 (5-й этаж, однокомнатная, общая площадь – 39,4 кв. м, общая площадь по СНБ – 41,9 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805740) | 123 000,00 | 5 000,00 |
| 2 | «Квартира 4» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-4 (1-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 62,9 кв. м, общая площадь по СНБ – 65,3 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805726) | 181 000,00 | 5 000,00 |
| 3 | «Квартира 5» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-5 (2-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 60,3 кв. м, общая площадь по СНБ – 62,8 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805727) | 170 000,00 | 5 000,00 |
| 4 | «Квартира 8» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-8 (2-й этаж, трехкомнатная, общая площадь – 72,2 кв. м, общая площадь по СНБ – 77,2 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805730) | 197 000,00 | 5 000,00 |
| 5 | «Квартира 12» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-12 (3-й этаж, трехкомнатная, общая площадь – 72,1 кв. м, общая площадь по СНБ – 77,1 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805734) | 196 000,00 | 5 000,00 |
| 6 | «Квартира 13» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-13 (4-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 60,0 кв. м, общая площадь по СНБ – 62,5 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805735) | 169 000,00 | 5 000,00 |
| 7 | «Квартира 16» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-16 (4-й этаж, трехкомнатная, общая площадь – 72,2 кв. м, общая площадь по СНБ – 77,2 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805738) | 197 000,00 | 5 000,00 |
| 8 | «Квартира 17» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-17 (5-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 60,0 кв. м, общая площадь по СНБ – 62,5 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805739) | 165 000,00 | 5 000,00 |
| 9 | «Квартира 20» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-20 (5-й этаж, трехкомнатная, общая площадь – 72,3 кв. м, общая площадь по СНБ – 77,3 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805742) | 192 000,00 | 5 000,00 |
| 10 | «Квартира 21» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-21 (1-й этаж, трехкомнатная, общая площадь – 68,7 кв. м, общая площадь по СНБ – 71,1 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805743) | 183 000,00 | 5 000,00 |
| 11 | «Квартира 22» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-22 (1-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 58,3 кв. м, общая площадь по СНБ – 63,0 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805744) | 170 000,00 | 5 000,00 |
| 12 | «Квартира 24» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-24 (1-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 60,1 кв. м, общая площадь по СНБ – 65,1 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805746) | 168 000,00 | 5 000,00 |
| 13 | «Квартира 25» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-25 (2-й этаж, трехкомнатная, общая площадь – 68,6 кв. м, общая площадь по СНБ – 71,1 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805747) | 186 000,00 | 5 000,00 |
| 14 | «Квартира 26» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-26 (2-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 58,5 кв. м, общая площадь по СНБ – 63,3 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805748) | 175 000,00 | 5 000,00 |
| 15 | «Квартира 29» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-29 (3-й этаж, трехкомнатная, общая площадь – 68,6 кв. м, общая площадь по СНБ – 71,1 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805751) | 186 000,00 | 5 000,00 |
| 16 | «Квартира 30» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-30 (3-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 58,4 кв. м, общая площадь по СНБ – 63,3 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805752) | 175 000,00 | 5 000,00 |
| 17 | «Квартира 32» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-32 (3-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 60,1 кв. м, общая площадь по СНБ – 65,2 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805754) | 172 000,00 | 5 000,00 |
| 18 | «Квартира 33» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-33 (4-й этаж, трехкомнатная, общая площадь – 68,7 кв. м, общая площадь по СНБ – 71,2 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805755) | 187 000,00 | 5 000,00 |
| 19 | «Квартира 34» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-34 (4-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 58,3 кв. м, общая площадь по СНБ – 63,1 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805756) | 174 000,00 | 5 000,00 |
| 20 | «Квартира 36» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-36 (4-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 60,2 кв. м, общая площадь по СНБ – 65,2 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805758) | 173 000,00 | 5 000,00 |
| 21 | «Квартира 37» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-37 (5-й этаж, трехкомнатная, общая площадь – 68,7 кв. м, общая площадь по СНБ – 71,1 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805759) | 183 000,00 | 5 000,00 |
| 22 | «Квартира 38» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-38 (5-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 58,3 кв. м, общая площадь по СНБ – 63,1 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805760) | 170 000,00 | 5 000,00 |
| 23 | «Квартира 40» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-40 (5-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 60,1 кв. м, общая площадь по СНБ – 65,2 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805762) | 168 000,00 | 5 000,00 |

**Шаг аукциона:** 5 000,00 бел. руб.

**Продавец имущества:** ОАО «Минский домостроительный комбинат», ул. Пономаренко, 43, 220015, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов:**

1. Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

2. Расходы, связанные с государственной регистрацией договора купли-продажи и основанных на нем прав, оплачиваются победителем торгов (покупателем).

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минский домостроительный комбинат», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, включая индивидуальных предпринимателей, внесшие задаток по соответствующему предмету торгов и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического или физического лица (для физического лица – документ, удостоверяющий личность; для представителя физического лица – документ, удостоверяющий личность представителя и нотариально заверенная доверенность; для представителя юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица), а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску и Минской области, БИК BPSBBY2X, 220035, г. Минск, пр-т Машерова, д. 80, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в торгах (назначение платежа – задаток для участия 16.06.2020 в аукционных торгах по продаже жилых помещений по предмету торгов №__). Участнику, не ставшему победителем торгов (покупателем), внесенный задаток (задатки) возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. Не допускается продажа предмета торгов по начальной цене. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом имущества и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

Торги проводятся **16 июня 2020 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 18.05.2020 по 12.06.2020 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу осмотра жилых помещений обращаться по телефонам: (017) 207-20-60, (044) 777-11-58.

**Телефоны для справок:** (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 207-20-60, (044) 777-11-58 (ОАО «Минский домостроительный комбинат»).

Дополнительная информация размещена на официальном сайте организатора торгов – www.mgcn.by.

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: ОАО «СПРС» (УНП 600072670) 220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 65А, пом. 221, в лице управляющего по делу о банкротстве юридического частного предприятия «Агентство правовых услуг», тел. +375 29 656-08-68.

Публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **16 июня 2020 г. в 09.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Здание магазина № 2 (инв. №644/С-49352), площадью 267,70 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Долговский с/с, аг. Долгое, ул. Зеленая, 37 | 202 300,00 |
| 2 | Здание магазина № 1 (инв. №644/С-49349), площадью 139,40 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Долговский с/с, аг. Долгое, ул. Зеленая, 9 | 105 200,00 |
| 3 | Здание магазина № 8 (инв. №644/С-49348), площадью 99,40 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Долговский с/с, аг. Долгое, ул. Зеленая, 15 | 65 100,00 |
| 4 | Здание нежилое (инв. №644/С-53514), площадью 344,40 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, г. п. Старобин, ул. Лесная, 7/1 | 173 900,00 |
| 5 | Здание магазина № 6 площадью 78,00 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, г. п. Старобин, ул. Молодежная, 14А | 53 000,00 |
| 6 | Магазин площадью 110,00 кв. м, расположенный по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Копацевичский с/с, аг. Новополесский, ул. Юбилейная, 2А | 80 100,00 |
| 7 | Магазин № 9 (инв. №642/С-34091), площадью 161,20 кв. м, расположенный по адресу: Минская обл., Копыльский р-н, г. Копыль, ул. 50 лет БССР, 15 | 142 300,00 |
| 8 | Транспортное средство VOLKSWAGEN CADDY, гос. № 6022 КТ-5, 2011 г. в. | 9 300,00 |
| 9 | Транспортное средство VOLKSWAGEN CADDY, гос. № 6023 КТ-5, 2011 г. в. | 8 900,00 |
| 10 | Транспортное средство HYUNDAI SONATA, гос. № 9904 РТ-7, 2005 г. в. | 3 100,00 |

Местонахождение транспортных средств – Минский р-н, Михановичский с/с, д. Дубовый Лес, база «СпецКомплект», тел. для ознакомления и осмотра с предметами торгов +37529 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 16.05.2020 09.00 по 15.06.2020 17.00 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## Извещение о проведении повторного аукциона

**Организатор аукциона:** ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703

**Продавец:** ОАО «СПЕЦРЕМОНТ», 220036, г. Минск, Бетонный проезд, 13

**Предмет аукциона: недвижимое имущество, реализуемое одним лотом**

**- Административно-бытовой корпус (Здание административно-хозяйственное)** общей площадью 376,5 кв. м, инвентарный номер 443/С-17850. Адрес: Гродненская обл., Сморгонский р-н, Залесский с/с, 13, административно-бытовой корпус северо-западнее д. Михневичи.
**- Производственно-бытовой корпус** (Здание нежилое) общей площадью 376,5 кв. м, общей площадью 443/С-17850. Адрес: Гродненская обл., Сморгонский р-н, Залесский с/с, п/о Михневичи.
В состав лота входит следующее оборудование: шкаф ВРУ (инв. номер 21675), кран-балка (инв. номер 50094).
**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 0,2872 га для размещения объектов неустановленного назначения (эксплуатации и обслуживания зданий).

**Начальная цена с НДС 20 % – 29 150,40 бел. руб.**
**Шаг аукциона – 1 457,52 бел. руб.**

**Порядок ознакомления:** в рабочие дни с 8-00 до 17-00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственные лица: Каминский Павел Иванович, +37529-659-14-39, Шутович Татьяна Михайловна, 8029-867-23-33

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** не более 30 (тридцати) дней со дня заключения договора купли-продажи (если иное не предусмотрено договором купли-продажи)

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 22.04.2020 г.

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **05.06.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **03.06.2020 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Контактные телефоны:** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

# КОШТ ЛАКДАЎНА




## Як свет выходзіць з каранціну?

**Сёння аднаўляецца чэмпіянат Германіі па футболе. Пра гэта напярэдадні заявіў выканаўчы дырэктар Нямецкай футбольнай лігі (DFL) Крысціян Зайферт, паведаміў вядучы нацыянальны спартыўны часопіс Kicker. Паўза была выклікана пандэміяй каранавіруса і адпаведнымі абмежаваннямі, уведзенымі па ўсім свеце, у тым ліку і ў ФРГ. Футбол у Германіі сярод нацыянальных прыярытэтаў, таму пытанне аднаўлення першынства бундэслігі вырашалася на найвышэйшым узроўні. Канцлер Германіі Ангела Меркель падчас відэаканферэнцыі з кіраўнікамі рэгіёнаў заявіла, што футбольны чэмпіянат краіны адновіцца ў другой палове мая, а ўжо канкрэтную дату скарэкціраваў DFL. Еўропа пакрысе прыходзіць у сябе пасля ўспышкі пандэміі COVID-19. Абмежаванні адмяняюцца і ў іншых кутках планеты. Як свет выходзіць з лакдаўна?**

### СВАЯ МАДЭЛЬ

Згодна з Оксфардскім тлумачальным слоўнікам, lockdown — гэта афіцыйны загад, які абмяжоўвае рух людзей у сувязі з небяспечнай сітуацыяй. Тэрмін сёлета ўвайшоў у шырокае выкарыстанне з увядзеннем у шэрагу краін жорсткага каранціну ў спадзяванні запаволіць ход пандэміі каранавіруса. Кошт лакдаўна аказаўся надзвычай высокі як у эканамічным, так і ў сацыяльным аспекце. Шлях да выхаду з каранціну кожная краіна распрацоўвае самастойна — нават у Еўрасаюзе замест чаканай сінхранізацыі дзяржавы выпрацоўваюць уласныя рашэнні. Мадэлі розных краін часта звязваюць толькі ўпор на эпідэміялагічную сітуацыю і паэтапнае зняцце абмежаванняў, адзначае gazeta.ru. Пандэмія моцна ўдарыла не толькі па краінах Еўрасаюза, але і па рэпутацыі гэтага аб'яднання. Жорсткія абмежаванні для барацьбы з эпідэміяй дзяржавы ўводзілі без каардынацыі са сваімі партнёрамі, што стварыла шэраг цяжкасцяў пры вырашэнні крызісных сітуацый. У прыватнасці, улады Італіі не раз абвінавачвалі сваіх саюзнікаў у недастатковай дапамозе і паказвалі на праблемы з «еўрапейскай салідарнасцю».

Асабліва многа пытанняў узнікала да органаў кіравання ЕС, якія не змаглі скаардынаваць аб'яднанне для агульнага адказу на выклік, кінуты пандэміяй. Дзеля справядлівасці варта адзначыць, што агульнай сістэмы аховы здароўя ў Еўрасаюзе няма, так што на фоне эпідэміі ў Бруселя не было інструментаў, неабходных для хуткага рэагавання, заўважае gazeta.ru. Зрэшты, калі большасць краін саюза пачала набліжацца да піку захворвання, паўстала пытанне аб зняцці абмежаванняў, і тут Еўракамісія паспрабавала сінхранізаваць дзеянні дзяржаў-членаў, прадставіўшы ім паэтапны план па выхадзе з крызісу. Аднак спроба ўзяць пад кантроль гэты працэс поспехам не ўвянчалася, і краіны, як і ў пачатку пандэміі, самастойна распрацавалі неабходныя мадэлі па адмене абмежавальных мер і аднаўленні эканомікі.

Адна з першых на зняцце абмежаванняў адважылася Аўстрыя — пачынаючы з 14 красавіка ў краіне пачалі працаваць невялікія крамы, а з 1 мая адкрыліся буйныя гандлёвыя пункты і прадпрыемствы. Наступны этап — адкрыццё рэстаранаў і рэлігійных месцаў з сярэдзіны мая. Пад канец чэрвеня аўстрыйскія ўлады разлічваюць зняць забарону на масавыя мерапрыемствы, але пакуль сходы дазволены толькі ў колькасці да 10 чалавек.

Такім чынам, Аўстрыя задала трэнд на выхад з крызісу ў Еўропе, але капіраваць яе мадэль іншыя дзяржавы не сталі. У прыватнасці, у Бельгіі ў першую чаргу адкрыліся садовыя цэнтры і крамы «Зрабі сам», з 4 мая пачаў працаваць шэраг гандлёвых пунктаў па продажы тканін разам з некаторымі кампаніямі. Пры гэтым наведванне сяброў і блізкіх даступна бельгійцам ужо з 10 мая, а з 11 мая — усе крамы. Калі ў Аўстрыі школы пачалі часткова адкрывацца ў пачатку апошняга вясновага месяца, то Бельгія гатовая пайсці на гэты крок толькі з 18 мая. Масавыя мерапрыемствы там могуць быць дазволеныя толькі ў верасні.




Да таго часу як Бельгія адкрые школы, у Чэхіі ўжо будуць працаваць рэстараны разам з кавярнямі і барамі. Усе буйныя крамы ўвогуле сталі даступныя жыхарам краіны яшчэ ў канцы красавіка. З 11 мая чэшскія ўлады зрабілі магчымым правядзенне мерапрыемстваў з удзелам да 100 чалавек. Акрамя таго, Чэхія стала адной з нешматлікіх краін ЕС, якія дазволілі сваім грамадзянам выязджаць за мяжу.

У той жа час у суседняй Германіі ўжо адкрыты ўсе крамы, хоць таксама існуе некаторы падзел унутры дзяржавы. Кіраўнікі федэральных зямель маюць права самастойна прымаць рашэнне па адмене ці ўвядзенні абмежаванняў, скаардынаваўшы іх з урадам. Адкрыццё крам у ФРГ не азначае адмену сацыяльных абмежаванняў і масачнага рэжыму ў грамадскіх месцах і транспарце як мінімум да пачатку лета — падобныя рэчы датычацца ўсіх еўрапейскіх краін.

### КІНО І ГОЛЬФ

Падчас тэлезвароту да нацыі прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Борыс Джонсан абвясціў, што з 13 мая будзе дазволена без абмежавання займацца спортам на вуліцах, загараць, ездзіць на аўтамабілях. Прэм'ер таксама заявіў, што людзі, у якіх няма магчымасці працаваць дома, змогуць вярнуцца на свае рабочыя месцы, але устрымліваючыся ад паездак на грамадскім транспарце. У першую чаргу гэта датычыцца работнікаў будаўнічай галіны і прамысловасці. Борыс Джонсан дапусціў, што на наступным этапе паслабленняў з 1 чэрвеня могуць пачаць работу крамы і школы, а з ліпеня — некаторыя гатэлі і грамадскія месцы. Тым не менш трэба кантраляваць распаўсюджванне каранавіруса, і цалкам адмяніць каранцінныя меры яшчэ нельга, лічыць брытанскі прэм'ер-міністр.

У Францыі з 11 мая ва ўсіх гарадах адмянілі абавязковае выкарыстанне папяровага фармуляра або электроннага пропуска, з якім дазвалялася пакідаць дом на непрацяглы час. Разам з тым у людзей, якія адпраўляюцца на работу ў Парыжы, павінна быць уласнаручна напісаная запіска альбо даведка з пячаткай ад работадаўцы, у якой пазначаецца час паездкі. Гэты дакумент пасажыры грамадскага транспарту абавязаны прад'яўляць кантралёрам, у адваротным выпадку ім пагражае штраф мінімум 135 еўра. Пасажыры таксама павінны насіць маскі. Адкрываюцца ўсе крамы і рынкі, акрамя буйных гандлёвых цэнтраў плошчай 40 тысяч квадратных метраў і больш. Паркі і скверы ў большасці гарадоў застаюцца зачыненымі. Усе кавярні і рэстараны закрытыя як мінімум да чэрвеня. З 11 мая школы адкрыты для настаўнікаў, якія павінны падрыхтаваць класы да вяртання вучняў. Францыя была на строгім каранціне на працягу 56 дзён, за гэты час памерла ад каранавіруса больш за 26 тысяч чалавек.

У Нідэрландах аднавілі работу дзіцячыя садкі і пачатковыя школы, адкрываюцца бібліятэкі, цырульні і салоны прыгажосці. Адменена забарона на занятак бескантактавымі відамі спорту, такімі як тэніс і гольф. Пачатак наступнага этапу зняцця абмежаванняў намечаны на 1 чэрвеня, калі ў ранейшым рэжыме павінен пачаць работу грамадскі транспарт, адкрыюцца рэстараны, музеі, тэатры і кінатэатры. З 2 чэрвеня будуць працаваць сярэднія школы.

У многіх рэгіёнах Іспаніі з 11 мая дазволена сустракацца з сябрамі і роднымі, якія жывуць у адной правінцыі, але нельга збірацца групамі больш за 10 чалавек. Пакуль яшчэ забаронена наведваць пажылых людзей, якія знаходзяцца ў дамах састарэлых. Гуляць і займацца спортам на вуліцы па-ранейшаму трэба ў тыя часавыя інтэрвалы, якія былі ўсталяваныя раней для розных груп асоб. Часткова аднавілі сваю дзейнасць цэрквы, музеі, тэатры і спартыўныя залы. Гатэлі будуць адкрыты, але без зон агульнага карыстання і абедзенных залаў. Паведамляецца, што пакуль гэта не закране, у прыватнасці, рэгіёнаў Мадрыда і Барселоны, якія пры спрыяльным развіцці сітуацыі змогуць перайсці да новай фазы змякчэння каранцінных мер з 18 мая.

У Швейцарыі аднаўляюцца заняткі ў сярэдніх школах, адкрываюцца музеі, бібліятэкі, рэстараны, спортпляцоўкі, а таксама крамы, у якіх прадаюцца адзенне і абутак, буцікі модных аксесуараў. У Чэхіі пасля працяглага перапынку пачалі працаваць гандлёвыя цэнтры плошчай больш за 2,5 тысячы квадратных метраў, цырульні, салярыі, масажныя і касметычныя салоны. Аднаўляюць работу музеі, мастацкія галерэі, тэатры і кінатэатры, дзе на спектаклях і кінасеансах зможа прысутнічаць да 100 гледачоў.

### У ЧАКАННІ ДРУГОЙ ХВАЛІ

Акрамя Еўропы, да выхаду з крызісу жадае прыступіць найбольш пацярпелая ад віруса краіна — ЗША. Амерыканскі лідар Дональд Трамп прасоўвае ідэю аб зняцці абмежаванняў яшчэ з красавіка. План Вашынгтона ўключае тры этапы. Але вырашаць, як выходзіць менавіта з абмежавальных мер, трэба будзе непасрэдна губернатарам штатаў, якія ўжо рыхтуюць уласныя распрацоўкі. Цяпер нават прыблізная дата пачатку «адкрыцця» ЗША невядомая, бо эпідэміялагічная абстаноўка складваецца не найлепшым чынам.

Да пачатку паступовага выхаду з крызісу, выкліканага вірусам, падключаюцца і іншыя дзяржавы. Жыхары Малайзіі ўжо выходзяць на работу, у краіне адкрываюцца рэстараны і крамы, і нават грамадскі транспарт аднавіў сваю дзейнасць. Пачынаючы з 3 мая ўлады знялі забарону на перамяшчэнне ўнутры краіны і за яе межамі — пакуль абмежаванні захоўваюцца ў дачыненні да масавых мерапрыемстваў. Пазітыўная тэндэнцыя назіраецца і ў Індыі, дзе ўрад прыступіў да зняцця жорсткіх мер у так званых зялёных зонах. Рэгіёны з найменшай колькасцю выпадкаў каранавіруса адкрываюць крамы, у тым ліку адмяняецца забарона на продаж алкаголю. З 4 мая дазволены сходы да 50 чалавек, але жыхароў усё ж заклікаюць часткова выконваць рэжым ізаляцыі, каб пазбегнуць рэзкага скачка захворвання.

Пры гэтым, пакуль Індыя пачала рабіць асцярожныя крокі да выхаду з крызісу, Ліван прыступіў ужо да другога этапу адкрыцця краіны. Тут пачалі працаваць цырульні і салоны па продажы аўтамабіляў, а ў сталіцы знялі абмежаванні на прагулкі ў дзённы час. Аднак пагатабаванні на нашэнне ахоўных масак, пальчатак і захаванне сацыяльнай дыстанцыі засталіся. У той жа час у Ізраілі перастала дзейнічаць забарона на выхад з дому без прычыны, таксама былі знятыя абмежаванні на правядзенне малітваў на адкрытай прасторы далей чым за 500 метраў ад дому. Аднак забарона на сходы больш чым 19 чалавек засталася ў сіле.

Улады Саудаўскай Аравіі таксама аслабілі абмежавальныя меры. У прыватнасці, кароль Салман ібн Абдул-Азіз Аль Сауд распарадзіўся скараціць працягласць каменданцкай гадзіны ва ўсіх рэгіёнах, передае DW. Аднак паслабленне не распаўсюджваецца на цэнтр мусульманскага паломніцтва — Меку, дзе застаецца ў сіле 24-гадзінная каменданцкая гадзіна. У самым густанаселеным штаце Аўстраліі — Новым Паўднёвым Уэльсе — улады вырашылі паслабіць каранцін, дазволіўшы людзям хадзіць у госці і на пляжы. Улады таксама знялі забарону на заняткі тэнісам, але трэніравацца можна толькі па адным, рыштунак павінен быць індывідуальны, і на традыцыйны поціск рукі пасля гульні таксама варта пакуль забыцца. Урад Інданезіі падрыхтаваў план паступовага выхаду з эпідэміялагічнага крызісу для ажыўлення некаторых галін эканомікі. Ён будзе рэалізоўвацца ў пяць этапаў, пачынаючы з 1 чэрвеня.

Зрэшты, казаць, што ўсе краіны аднолькава гатовыя да зняцця абмежаванняў, уведзеных для барацьбы з пандэміяй, пакуль не даводзіцца. «І Азія, і Еўропа каранцін наносіць сур'ёзны эканамічны і псіхалагічны ўрон. Жаданне як мага хутчэй зняць яго — больш чым вытлумачальнае», — адзначылі ў сваёй ацэнцы выхаду з лакдаўна эксперты МВФ. Разам з тым яны папярэдзілі, што Стары Свет горш падрыхтаваны да гэтага, чым Азія, якая першая прыняла ўдар пандэміі. «У кожнага свая стратэгія, але Еўропа, падобна, выходзіць з каранціну на больш ранняй стадыі эпідэміялагічнага цыклу, чым Азія. Да таго ж магчымасці поўнамаштабнага тэсціравання, адсочвання кантактаў і ізаляцыі ачагоў заражэння ў Еўропе саступаюць азіяцкім аналагам», — папярэдзілі эксперты МВФ.

Дарэчы, ужо 11 мая Еўракамісія заклікала членаў ЕС рыхтавацца да другой хвалі захворвання. Галоўная крыніца страхаў — гісторыя сусветных эпідэмій. Як вядома, другая хваля «іспанкі» ў 1918 годзе значна перавысіла па маштабе і колькасці ахвяр першую.



Захар БУРАК.

Аляксандр КУДРАЎЦАЎ:

# «Можна апусціць рукі, толькі навошта?»

**Адзін з самых яркіх гульцоў у гісторыі беларускага баскетбола ўспамінае найлепшыя моманты сваёй кар'еры**




**Праз тыдзень Аляксандру Кудраўцаву споўніцца 40. У жніўні 2019-га, па заканчэнні баскетбольнага сезона, ён абвясціў аб завяршэнні кар'еры — кар'еры, якая была вельмі яркая. На працягу 22 гадоў Аляксандр выступаў за беларускія, польскія, украінскія, турэцкія і літоўскія клубы, але апошнія сезоны правёў у складзе мінскіх «Цмокаў» і хацеў скончыць сваю кар'еру менавіта ў гэтай камандзе. Дзевяць разоў ён станавіўся чэмпіёнам Беларусі і неаднаразова прызнаваўся найлепшым баскетбалістам краіны. За 16 гадоў выступлення за нацыянальную зборную Кудраўцаў не прапусціў ніводнага матча і заўсёды адзначаў, што абараняць гонар краіны асабліва важна для яго. Хоць за гэты час Аляксандр і не дабіўся са зборнай сваёй галоўнай мэты, яна ў яго засталася — цяпер ён гуляе на аматарскім узроўні і спадзяецца трапіць на чэмпіянат Еўропы і свету ў катэгорыі ветэранаў. У сваім інтэрв'ю напярэдадні дня нараджэння Аляксандр Кудраўцаў расказвае пра тое, чаму ў сваёй новай рабоце не сышоў далёка ад баскетбола, ці лёгка яму далося рашэнне аб завяршэнні кар'еры і што чакае беларускі мужчынскі баскетбол у найбліжэйшы час.**

***— Аляксандр, адразу пасля завяршэння гульнявой кар'еры вы перайшлі на новую пасаду. Раскажыце пра сваю цяперашнюю работу.***

— Я адразу хацеў кудынебудзь акунуцца, таму што апошнія 20 гадоў нічым, акрамя баскетбола, не займаўся, і, каб адцягнуцца, мне трэба было хутчэй знайсці штосьці новае. Даведаўся, што адкрыта вакансія на пасаду начальніка жаночай нацыянальнай каманды па баскетболе, пагаварыў з трэнерамі, прадстаўнікамі федэрацыі — вырашылі, што я магу паспрабаваць. Цяпер гэтая праца дае мне задавальненне. Нічога складанага ў ёй няма, праўда, шмат папяровай работы, але з баскетбольнай спецыфікай я добра знаёмы і мне практычна не давялося вучыцца чамусьці новаму.

***— Банальнае пытанне: трэнерскую дзейнасць для сябе вы не разглядалі?***

— Не, на цяперашні момант мне гэта не зусім цікава. Жыццё і час пакажуць, але пакуль я сябе ў гэтым не бачу, мне хапае выхавання сваіх дваіх дзяцей.

***— З пераходам на новую работу ў вас з'явілася больш вольнага часу?***

— Я б не сказаў — шмат часу праводжу ў офісе, вырашаючы нейкія пытанні. Вольны час з'явіўся толькі цяпер, калі мы нікуды не ездзім з-за пандэміі. Калі б гэтага ўсяго не было, выязны графік са зборнай і з маёй ветэранскай камандай быў бы даволі шчыльны. Таму цяпер больш часу стараюся прысвячаць дзецям, бо яны ж сядзяць дома.

***— Многія спартсмены адзначаюць, што рашэнне завяршыць кар'еру даецца даволі складана...***

— Былі і раней моманты, калі я хацеў заканчваць са зборнай краіны, каб засяродзіцца на клубнай рабоце, але атрымалася так, што скончыў і са зборнай, і з клубам адначасова. Хоць у мяне былі яшчэ прапановы пагуляць у розных краінах — дарэчы, у розных, акрамя Беларусі. Аднак я прыняў рашэнне перайсці на іншую работу. Унутры саспела такое пачуццё, што трэба зрабіць гэта цяпер, момант надышоў. Я такі чалавек, што калі штосьці адчуваю, магу спантанна прыняць вельмі нечаканае рашэнне. Але гэтае рашэнне не магу назваць раптоўным, таму што абдумваў яго на працягу ўсяго апошняга сезона, настройваў сябе на тое, што гэта, хутчэй за ўсё, будзе апошні год, абмяркоўваў гэта з трэнерамі «Цмокаў».

***— Як адчувалі сябе ў апошнія гады ў мінскім клубе? Можна сказаць, што асноўная частка гульцоў — гэта ўжо зусім іншае пакаленне...***

— З беларусаў канкурэнцыю там мне складаў толькі Віталь Лютыч, яго ўжо таксама можна назваць немаладым гульцом. Іншыя баскетбалісты яшчэ маладыя, але я ўсё роўна мог бы з імі падужацца. У асноўным у апошнія гады мне давялося гуляць з пакаленнем, якое маладзейшае за мяне на 12-15 гадоў. У прынцыпе, адчуваў сябе з імі на адной хвалі, хлопцы вельмі кампанейскія, камунікабельныя, ніякіх жартаў ад іх на свой адрас я ніколі не чуў, стаўленне заўсёды было паважлівае і прафесійнае.




* * *

***— Пасля таго як вы згулялі свой апошні матч на прафесійным узроўні, без баскетбола ўсё роўна не засталіся...***

— Так, таму што на аматарскі ўзровень я выйшаў ужо дзесьці ў верасні, кастрычніку. Мы гулялі на міжнародным турніры ў Латвіі. Потым прайшлі наступныя турніры, у маёй каманды нават была пераможная серыя — больш за 15 выйграных матчаў. Якраз перад эпідэміяй згулялі фінальны матч у Слоніме і прайгралі камандзе «Серабранка», добраму аматарскаму калектыву — так пераможная серыя спынілася. Планавалі ехаць на чэмпіянат Еўропы ў Будапешт у чэрвені, але яго, мабыць, адмянілі.

***— На аматарскім узроўні, напэўна, не хапае адрэналіну, залежнасці ад выніку?***

— Чаму? Мы заўсёды хочам выйграваць! У мяне каманда, дзе я ў сваё 40 гадоў самы малады, астатнім — 45, 60, 63 гады. Хлопцы там даўно не выйгравалі, а цяпер адчулі гэты смак, таму азарт велізарны. Шматлікія каманды, якія гуляюць супраць нас, нашмат маладзейшыя, і калі іх «абуваюць» дзядкі, становіцца крыўдна. Даходзіць нават да розных сутычак, таму што судзейства бывае не такое ўжо прафесійнае, пачуцці кіпяць. Мы атрымліваем асалоду, хоць, вядома, калі прайграем, то ўжо так не хвалюемся, а, наадварот, абдымаемся з сапернікамі, гутарым і дзелімся эмоцыямі.

* * *

***— Калі згадаць усю вашу кар'еру, які момант назвалі б самым яркім?***

— Іх было шмат. Але ў сваёй кар'еры я не прайшоў ні адной маладзёжнай або юніёрскай зборнай, мяне туды проста не бралі. Быў такі момант: мы гулялі на чэмпіянаце краіны ў фінале з камандай «Асіповічы», гэта быў, напэўна, 10-ы або 11-ы клас. Умова была такая: чыя каманда выйграе, той трэнер і сфарміруе склад юніёрскай зборнай. У фінале мы прайгралі, я тады ўжо выходзіў на лідзіруючыя ролі і набраў у гэтым матчы ачкоў 20, але мяне ў зборную не ўзялі, і ў маладзёжную таксама. Менавіта гэты момант даў мне велізарны стымул.

***— Але ж можна было паставіцца да яго і па-іншаму — наадварот, апусціць рукі...***

— Можна было. У любы момант можна апусціць рукі, толькі навошта? Можна апусціць іх на 30 секундаў, але сабрацца і падняць зноў. Дрэннага настрою ў свеце ў нас і так хапае, ніколі не варта здавацца.

***— З чым вы звязваеце той факт, што вас не выклікалі ў юніёрскую і маладзёжную зборныя?***

— Значыць, тыя людзі, якія кіравалі гэтымі камандамі, тады не бачылі ўва мне гульца, які мог ім дапамагчы ў той момант, я іх за гэта не вінавачу. Хтосьці раскрываецца раней, хтосьці пазней. Атрымалася так, што туды я не трапіў, але пратрымаўся ў баскетболе на прафесійным узроўні нашмат больш за астатніх. Магчыма, калі б тады гуляў у тых зборных, мой лёс склаўся б па-іншаму.

***— Але ў нацыянальную зборную ў выніку вы ўсё ж такі трапілі. Памятаеце момант, калі даведаліся, што вас выклікаюць у каманду?***

— Вядома! Гэта было перад міжнародным турнірам у Егіпце, мне тады было 22-23 гады. На той момант шмат людзей адмовілася прыехаць у зборную, а мяне ўжо раней падключалі да нацыянальнай каманды, але толькі трэніравацца. Гэта было, па-мойму, лета, старэйшыя хлопцы ўжо скончылі клубны сезон, хацелі больш адпачыць, а тут нейкі незапланаваны збор, таму многія адмовіліся. Былі чатыры месяцы, узялі двух віцебскіх хлопцаў майго ўзросту, мяне і яшчэ кагосьці. Можна сказаць, мне пашанцавала. Ужо на гэтым турніры я добра зарэкамендаваў сябе і замацаваўся ў зборнай. Пасля гэтага заключыў прафесійны кантракт і ў далейшым пачаў прыязджаць на кожны матч нацыянальнай каманды.

***— Пасля гэтага ў вас быў добры легіянерскі досвед, пагулялі ў розных краінах. Дзе адчувалі сябе найбольш камфортна?***

— Паўсюль было добра. У Польшчы я ведаў мову — шмат гадоў да гэтага, калі вучыўся ва ўніверсітэце, працаваў з дзецьмі, якія валодаюць польскай. Культура гэтай краіны таксама была мне блізкая, не ўзнікала праблем у побыце. У мяне да гэтага часу шмат сяброў у Польшчы. У Літве мне было таксама нармальна, хоць там ніхто не хацеў размаўляць па-руску, толькі па-англійску і па-літоўску. У Турцыі я гуляў з хлопцамі, з якімі перасякаўся раней. Напэўна, праблем не ўзнікала нідзе.

***— Што датычыцца прафесійнага ўзроўню баскетбола, дзе ён быў найбольш высокі?***

— Калі браць арганізацыйныя моманты, то гэта, вядома, Турцыя. Прылятаеш з гульняў, машыну падганяюць проста пад цябе, ты возіш з сабой толькі білеты і пашпарт. Там быў і ўзровень класны, і балельшчыкі добрыя. Добрая арганізацыя і ў Польшчы. Трошкі горш, вядома, у гэтым плане было ва Украіне, залы сціплыя, але затое ўзровень чэмпіянату вельмі высокі. Ну і ў «Цмокаў», вядома, калі каманда стала гуляць у лізе ВТБ, арганізацыйны ўзровень з кожным годам стаў павышацца. Цяпер у мінскім клубе адна з найлепшых арганізацый у плане ўзроўню камфорту для спартсменаў. Гэта і свая база, і аднаўленчы цэнтр, залы — толькі гуляй.

***— Тое, што апошнія гады вы правялі ў Беларусі, было вашым уласным жаданнем?***

— Толькі ў адно лета ў мяне была мінімальная колькасць прапаноў, а так на працягу ўсёй кар'еры, нават сёлета, было адразу некалькі варыянтаў за мяжой. Але я хацеў скончыць кар'еру ў «Цмоках». У Мінску ўжо былі дзеці, сям'я, трэба было пачынаць больш задумвацца пра гэта, таму не хацеў зрывацца. «Цмокі» гулялі на добрым узроўні, хацелася дамагчыся нейкіх мэт у лізе ВТБ, таму што ліга выдатная, каманда добрая. Сапернічаць супраць клубаў-мільянераў, такіх зорак, вельмі цікава.

* * *

***— За зборную Беларусі вы гулялі на працягу 16 гадоў і за гэты час не прапусцілі ніводнага матча.***

— Выступленні за зборную — гэта нешта асаблівае для мяне: ты гуляеш за сваю краіну, за свой дом, у якім вырас, якому ты аддадзены. Да зборнай заўсёды ставішся трапятліва, таму мы ніколі не патрабавалі нейкіх фінансавых узнагарод, хацелася толькі добрай арганізацыі. Зборная — гэта нешта асаблівае на самай справе, словамі гэта не перадасі. Нават цяпер, калі я гляджу матчы нацыянальнай каманды, адчуваю натхненне і эмацыянальны ўздым.

***— Ці ёсць матч за зборную, які запомніўся вам больш за ўсё?***

— Былі матчы, якія выйграваліся апошнім кідком на апошніх секундах, былі і матчы, якія на апошніх секундах прайграваліся апошнім кідком. Магу адзначыць гульню са зборнай Славеніі, усё ж такі гэта былі чэмпіёны Еўропы, якіх мы абыгралі. І хоць многія нашы балельшчыкі лічаць, што гэта быў нейкі другі ці трэці склад, гэта няпраўда. Там было як мінімум сем залатых медалістаў. Тая перамога для нас вельмі многае значыць, самая яркая з апошніх. Добрая гульня была ў Польшчы, калі перамаглі палякаў з розніцай 23 мячы. Быў добры матч у Беларусі з эстонцамі, калі мы выйгравалі 24 ачкі і, калі б яны не забілі нам два трохачковыя на апошніх секундах, мы б ужо гулялі на чэмпіянаце Еўропы. За зборную наогул вельмі шмат гульняў усплывае ў памяці.

***— Што скажаце цяпер пра беларускі мужчынскі баскетбол?***

— Да топ-турніраў мы былі блізкія гады тры таму, а зараз знаходзімся ў самым нізе. Сёння трэба даць шанц маладым, якія будуць

выступаць за зборную ў бліжэйшыя 6-8 гадоў, каб яны пачалі гуляць і па маленькіх прыступках крочыць усё вышэй і вышэй. Цяпер мы абыгралі дома добрых партугальцаў, потым кіпрыётаў. У лістападзе трэба яшчэ раз іх перамагчы, выйграць групу і трапіць далей у кваліфікацыі да чэмпіянату свету. І ісці вось так, крок за крокам. Думаю, калі наша моладзь будзе добра сябе рэкамендаваць, то, магчыма, у сусветным баскетболе мы будзем трохі вышэй.

***— На ваш погляд, чаго ім цяпер не хапае?***

— Цяжка сказаць, бо ў баскетбол цяпер гуляюць усе. Напэўна, усё ж такі псіхалогіі — я бачыў з залы толькі адну гульню з партугальцамі і, напрыклад, не ведаю, што здарыцца, калі Верамеенка не будзе гуляць за зборную, таму што дзякуючы яго велізарнай працы ў гульні з партугальцамі мы і перамаглі. Знікне такі дасведчаны воўк, прафесар нашай каманды, — цяжка сказаць, што будзе нават у лістападаўскіх матчах. Але я гляджу з аптымізмам, думаю, што ўсё ж такі гэтая група нашым хлопцам па зубах. Трэба браць у зборную больш лідараў, але сёлета нашы беларусы, на жаль, акрамя Максіма Салаша, не былі на лідзіруючых ролях у клубным баскетболе. А калі ўсе будуць у страі (Віталь Лютыч, Саша Семянюк, Кірыл Сітнік), павінна ўсё атрымацца.

***— Што скажаце пра баскетбольны чэмпіянат Беларусі?***

— Сёння безумоўны лідар — мінскія «Цмокі», там сабраны найлепшыя беларусы, добрыя легіянеры, але я лічу, што каманда павінна гуляць у чэмпіянаце Беларусі на больш ранніх стадыях. Плаўна падцягваецца «Барысфен» з Магілёва, у іх паляпшаецца арганізацыя, ёсць добры трэнер — калі б было яшчэ больш фінансаў, то і легіянераў было б больш. Пакуль мала моладзі, павінна быць больш баскетбалістаў высокага ўзроўню, тады яны змогуць падняць узровень чэмпіянату. А пакуль ён слабы і зусім нецікавы. Перш за ўсё патрэбны фінансы, каб падпісваць якасных легіянераў: калі будуць якасныя легіянеры, за імі падцягнуцца і беларусы.

***— У вашай кар'еры засталася нерэалізаваная мара?***

— Вядома, я хацеў пагуляць са зборнай на любым буйным сусветным і еўрапейскім турніры. Цяпер будзем дамагацца гэтага ў ветэранскім спорце.

***— Раскажыце аб вашых дзецях.***

— Малодшы сын ходзіць у садок і пару гурткоў, старэйшы займаецца баскетболам у клубе Мешчаракова, але мы не патрабуем ад іх нічога звышнатуральнага. Яны самі вызначацца, самі выберуць, чым захочуць займацца ў жыцці, але я падтрымаю любое іх рашэнне. Калі захочуць звязаць сваю кар'еру з прафесійным спортам, паспрабую дапамагчы, калі не — буду дапамагаць у іншых іх пачынаннях.

## Легенды спорту

# «Я быў таўставаты і высокі, не вельмі рухавы»

### Алімпійскаму чэмпіёну Андрэю Барбашынскаму — 50!

**Гандбол у Беларусі — самы тытулаваны гульнявы від спорту, ён прынёс краіне восем алімпійскіх чэмпіёнаў. Адзін з іх — Андрэй Барбашынскі, які 4 мая адсвяткаваў свой юбілей. У спартыўнай кар'еры ён выступаў за мінскі СКА, іспанскі «Хувентуд», венгерскі «Веспрэм», нямецкія «Хамельн» і «Эмсдэтэн». А сёння Андрэй Барбашынскі не толькі паважаная асоба ў спорце, але і паспяховы бізнесмен.**



Будучы чэмпіён нарадзіўся ў Ашмянах, яго спартыўны шлях пачаўся ў 12-гадовым узросце ў мясцовай дзіцяча-юнацкай школе. Першы трэнер Андрэя Барбашынскага — мясцовая легенда, Віктар Браніслававіч Рамулевіч, які да гэтага часу выхоўвае юных гандбалістаў, прысвяціў сваёй справе 50 гадоў. Менавіта ён калісьці разгледзеў талент у будучым чэмпіёне. Вопытны настаўнік, успамінаючы свайго самага вядомага выхаванца, кажа, што па першым часе маленькаму Андрэю не хапала жадання. *«Спачатку я мучыўся з ім, але калі ён адчуў смак забітых мячоў, за Андрэем хадзіць не трэба было»,* — адзначае Віктар Браніслававіч.

Андрэй Барбашынскі валодаў выдатнымі якасцямі і талентам, таму, калі быў васьмікласнікам, ужо гуляў з хлопцамі на тры гады старэйшымі за яго, хоць цяпер сам алімпійскі чэмпіён прызнаецца, што тады яго не вельмі цікавіў спорт. Ён добра вучыўся і імкнуўся дапамагаць бацькам. *«У нашым горадзе вельмі сур'ёзныя традыцыі гандбола, гэта была ці не адзіная секцыя ў Ашмянах. Мой першы трэнер Віктар Рамулевіч быў нядрэнным варатаром і не мог не заўважыць мяне з такім ростам. Тады трэнеры дзіцячых школ хадзілі на ўрокі фізкультуры ў агульнаадукацыйныя школы, дзе і звярнулі ўвагу на мае даныя. Спачатку я быў таўставаты і высокі, не вельмі рухавы. Ужо на той момант мой рост складаў 196 см, і на першай трэніроўцы Рамулевіч паставіў мяне ў вароты ў матчы са старэйшымі хлопцамі. Гульнявы працэс мне падабаўся, пакуль грунтоўна не «зарадзілі» ў галаву мячом, пасля гэтага выпадку вырашыў сысці»,* — успамінае Андрэй Барбашынскі. Але неўзабаве ён усё ж такі вярнуўся, а потым з'ехаў у Мінск у Рэспубліканскае вучылішча алімпійскага рэзерву, і яму хапіла характару, каб замацавацца ў сталіцы.



Дзякуючы ўпартасці і працавітасці Барбашынскага хутка заўважылі трэнеры з мінскага СКА — спачатку запрасілі ў дубль, а потым і ў галоўную каманду армейцаў. *«Цяпер у беларускім клубе складана сабе і ўявіць, каб уладальнік залатога медаля сусветнага форуму сядзеў на лаўцы запасных, а ў 1989-м у асноўным складзе СКА выходзілі пяць алімпійскіх чэмпіёнаў. Канкурэнцыя была адчувальная, але прабіўся ж. Спартак Пятровіч Міранович узяў за правіла даваць шанц новаму пакаленню. Нягледзячы на юны ўзрост, я быў вельмі запатрабаваны і ў маладзёжнай, і ў нацыянальнай зборнай СССР. Бывалі выпадкі — з самалёта ў самалёт толькі паспяваў перасаджвацца, каб з турніру «маладзёжкі» на збор галоўнай каманды паспець. У гэтай сітуацыі найважней — форму не пераблытаць»,* — жартуе Андрэй Станіслававіч.

